ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 36-ы
№ 101 (2255)
22 снежня 1967 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ГЭТАЯ падзея апісана ў раманах і вершах, ёй прысвечаны п'есы і кінафільмы. Вось як расказвае пра яе Аляксей Талстой у «Блуканнях па пакутах».

«...У пяціяруснай зале Вялікага тэатра, у тумане, надыханым людзьмі, ледзь свяціліся сотні лямпачак чырванаватым напалам. Было холадна, як у склепе. На вялікай сцэне, з палатнянымі аркамі ў кулісах, з боку цьмянай рампы сядзеў за сталом прэзідыум. Усе яны, павярнуўшы галовы, глядзелі ўгліб сцэны, дзе з каласнікоў звешвалася карта Еўрапейскай Расіі, пакрытая рознакаляровымі кружкамі... Перад картай стаяў маленькі чалавек у футравым палто, без шапкі. У руцэ ён трымаў доўгі кій і... час ад часу канцом кія паказваў на той ці іншы каляровы кружок, які загараўся адразу яркім святлом...

...Каб асвятляць на кароткія імгненні карту, — прыйшлося сканцэнтраваць усю энергію маскоўскай электрастанцыі, — нават у Крамлі, у кабінетах народных камісараў, былі вывінчаны ўсе лямпачкі...».

Гэта было 22 снежня 1920 года, калі VIII Усерасійскі з'езд Саветаў прыняў план ГОЭЛРО, план, натхніцелем якога быў Ленін.

І людзі, што сядзелі ў няпаленай зале тэатра, людзі, што ў гэты дзень атрымалі на хлебныя карткі некалькі жменяў аўса, стрымліваючы дыханне, слухалі даклад, і перад імі паўставалі далі, асветленыя заравам электрычнага кастра...

...Пра гэта мы гаворым з Якавам Яфімавічам Батвінікам, начальнікам Галоўнага ўпраўлення энергетыкі і электрыфікацыі пры Савеце Міністраў БССР.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

Энергетычнае сэрца Беларусі

На пытанні карэспандэнта «Літаратуры і мастацтва» адказвае начальнік Галоўнага ўпраўлення энергетыкі і электрыфікацыі пры Савеце Міністраў БССР Я. Я. БАТВІНІК

— Так, Ільіч марыў аб краіне суцэльнай электрыфікацыі, — заўважае ён. — Сёння гэта ява.

Я прашу Якава Яфімавіча сказаць некалькі слоў пра гісторыю беларускай савецкай энергетыкі.

— Пачыналі амаль з нуля. Першынец нашай энергетыкі — Асінбуд. Памятаю, з якім энтузіязмам будавалі гэтую электрастанцыю. Між іншым, ёй прысвяцілі свае творы многія беларускія пісьменнікі... У 1930 годзе электрастанцыя дала першы ток Віцебску, Магілёву, Оршы, Шклову, Дуброўне. І лініі электраперадач, што працягнуліся праз лясы і балоты, міма ветраных млыноў старых вёсак, як бы сімвалізавалі карэнныя змены ў жыцці народа.

К канцу 1940 года выпрацоўка энергасістэмы рэспублікі складала ўжо 508 мільёнаў кілават-гадзін, перавысіўшы ўзровень 1920 года ў 125 разоў.

Вайной амаль уся энергагаспадарка Беларусі была разбурана. У 1944 годзе ў нас выпрацоўвалася электраэнергіі ў паўтара раза менш, чым у 1913 годзе.

— А цяпер?

— Зараз устаноўленая магутнасць беларускай энергетыкі — 2 мільёны кілават, а выпрацоўка — 10 мільярдаў кілават-гадзін. Гэта ў 2,5 тысячы разоў больш, чым выпрацоўвалася на тэрыторыі рэспублікі ў 1913 годзе.

За апошнюю сямігодку была сфарміравана на сучасным узроўні адзіная белэнергасістэма — своеасаблівае энергетычнае сэрца Беларусі — аснову якой складаюць шэсць буйных электрастанцый — Бярозаўская, ДРЭС, Мінская ТЭЦ-3, Васілевіцкая ДРЭС, Полацкая ТЭЦ-2, Смалявіцкая ДРЭС і Віцебская ТЭЦ, магістральныя лініі электраперадач з напружаннем 330—220 кілавольт, магутныя апорныя капітальныя падстанцыі. Агульная працягласць ліній электраперадач усіх напружанняў складае 127,5 тысячы кіламетраў. Па тэмпах росту вытворчасці электраэнергіі мы апярэджваем такія капіталістычныя краіны, як Англія, Францыя, ФРГ, Японія...

— Я чуў, што электраэнергіяй рэспублікі карыстаюцца і за яе межамі?

— Так. Лішкі энергіі транспарціруюцца за межы Беларусі — у краіны СЭУ, Бранскую і Ленінградскую вобласці і аб'яднанае Паўночнага Захаду, якое звязана ў сваю чаргу з адзінай энергасістэмай Еўрапейскай часткі СССР.

Я цікаўлюся, як зараз забяспечваецца электраэнергіяй сельская мясцовасць, бо яшчэ некалькі гадоў назад з гэтым не ўсё было ў парадку.

— Да 28 кастрычніка гэтага года завершана электрыфікацыя ўсіх калгасаў і саўгасаў, а таксама населеных пунктаў, якія маюць не менш дзесяці двароў. Зараз сельская гаспадарка рэспублікі спажывае 600—700 мільёнаў кілават-гадзін — гэта ўдвая больш, чым выпрацоўвалася электраэнергіі ў Беларусі напярэдадні Айчыннай вайны.

Якаў Яфімавіч пераводзіць гаворку на людзей, што забяспечваюць такі высокі ўзровень энергетыкі. У сістэме ўпраўлення працуе 30 тысяч чалавек, з іх звыш 5 тысяч інжынерна-тэхнічных работнікаў.

— У нас выдатныя кадры,— з гонарам гаворыць Батвінік, — 247 беларускіх энергетыкаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Начальнік упраўлення расказвае, што многія энергапрадпрыемствы рэспублікі сістэматычна перавыконваюць вытворчыя заданні, эканомяць паліва. Так, толькі сёлета сэканомлена да 60 тысяч тон умоўнага паліва.

Дарэчы, паліва... Я расказваю Якаву Яфімавічу, што аднойчы ў Міністэрстве меліярацыі рэспублікі пры мне зайшла размова пра тое, што электрастанцыі Беларусі «з'ядаюць» вельмі многа торфу, запасы якога таюць. Цікаўлюся, што думае наконт гэтага галоўны энергетык Беларусі.

— Я не падзяляю думкі таварышаў, пра якіх вы расказваеце. Запасаў паветрана-сухога торфу ў рэспубліцы хопіць на многа дзесяткаў гадоў. Але гэта не азначае, што мы не думаем пра яго эканомію. Да таго ж, амаль палавіну паліўных рэсурсаў, якія мы выкарыстоўваем, складаюць вугаль і нафтапрадукты.

Якаў Яфімавіч расказвае, што зараз надзвычай вялікая ўвага камбінаванню вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі — цеплафікацыі. Пара і гарачая вада на электрастанцыях не толькі выпрацоўваюць электрычнасць, але яшчэ і ацяпляюць жыллё. Сёння цеплаэлектрацэнтралі рэспублікі абагреваюць 50 тысяч шматкватэрных дамоў.

Заходзіць гаворка пра бліжэйшыя планы энергетыкаў рэспублікі. К канцу пяцігодкі вытворчасць электраэнергіі падвоіцца. Дасць ток Лукомльская ДРЭС, адна з буйнейшых у СССР. Па новых маршрутах пакрочаць апоры ліній электраперадач, несучы ток новым пасёлкам і гарадам, заводам і шахтам...

— Сёння мы адзначаем Дзень энергетыка, — гаворыць Якаў Яфімавіч.—Дата гэтая выбрана невыпадкова — яна ў гонар таго далёкага дня, калі быў прыняты ленінскі план электрыфікацыі краіны. Мы вельмі ганарымся, што і на нашу долю выпала шчасце быць выканаўцамі гэтага плана...

М. ЗАМСКІ.

І МЫ СВЯТКУЕМ...

КНІЖНЫЯ ВЫСТАЎКІ

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна афармлена кніжная выстаўка «Братняй Украіне — 50 гадоў». На ёй шырока прадстаўлена літаратура аб эканоміцы, прамысловасці, гісторыі і культуры братняй рэспублікі. Асобны раздзел прысвечаны ўкраінска-беларускім літаратурным сувязям. Тут ёсць шмат кніг і часопісных артыкулаў, дзе асвятляюцца гэтыя пытанні. Напрыклад, працы П. Ахрыменкі «Фальклорна - літаратурныя сувязі ўкраінскага і беларускага народаў», «Шаўчэнка і беларуская літаратура», кніга С. Александровіча «Старонкі братняй дружбы» і іншыя.

Мінская гарадская бібліятэка імя Янкі Купалы таксама прысвяціла спецыяльную кніжную выстаўку 50-годдзю Савецкай Украіны. На ёй прадстаўлены творы ўкраінскіх празаікаў і паэтаў, перакладзеныя на рускую і беларускую мовы, кнігі па гісторыі і культуры Украіны.

У ГАСЦЯХ — ПЕСНЯ СУСЕДЗЯЎ

Бліжэйшая суседка Брэсцкай вобласці — украінская Валынь. Тут трактары дзесяткі разоў за дзень парушаюць граніцу, дзеці аднолькава добра гавораць па-ўкраінску і па-беларуску.

На Брэсцкую студыю тэлебачання вельмі часта прыходзяць пісьмы з просьбай расказаць аб брацкай рэспубліцы, яе культуры, мастацтве. Выконваючы просьбы, Брэсцкае тэлебачанне вырашыла даць канцэрт украінскай музыкі. Тэлегледачы ўбачылі на сваіх экранах вядомых выканаўцаў украінскіх песень сясцёр Байко. Іх выступленне вельмі спадабалася — і сёстры Данніла, Марыя і Ніна нядаўна зноў выступілі па Брэсцкаму тэлебачанню. Перадача называлася «Шаўчэнкаўскія песні». Вёў яе карэспандэнт Львоўскай студыі тэлебачання Іван Кусько.

ГЭТА БЫЛО У НЕЖЫНЕ

Ёсць на Украіне горад з паэтычнай назвай Нежын. У гады вайны тут дзейнічала група адважных падпольшчыкаў, якую ўзначальваў Якаў Бацюк. Ён быў сляпы, але гэта не перашкаджала яму наводзіць жах на ворагаў.

Светлай памяці Героя Савецкага Саюза Якава Бацюка і яго таварышаў, якія загінулі ад рук фашыстаў, прысвяціў сваю п'есу «Добры дзень, Якаў» украінскі драматург Леў Сінельнікаў. Яна прынята да пастаноўкі Пінскім народным тэатрам.

УКРАІНА, ЦВЕЦЕ ЛЮБЫ, СОНЦАМ ГАДАВАНЫ...



На гэтым здымку — куточак старажытнага і вечна маладога Кіева: вядомы ўсім Крашчацік. Здымак зроблены той парою, калі цэнтральная магістраль сталіцы Савецкай Украіны патанае ў зеляніне славутых кіеўскіх каштанаў. Сёння ж на двары — снежань, і каштаны на Крашчаціку, пэўна, апрануліся ў марозную шэрань. Але затое паўсюль — чырвоныя палотнішчы сцягаў і транспарантаў, россыпы яркіх агнёў ілюмінацый. Кіеў і ўся Украіна страчае слаўнае свята—50-годдзе Украінскай Савецкай дзяржавы.

Нам, беларусам, асабліва радасна і прыемна вітаць са святам украінцаў — сваіх бліжэйшых суседзяў і братоў. Стагоддзямі доля беларуса ішла поруч з доляй украінца, і стагоддзямі доля гэта адварочвалася ад іх. Толькі Вялікі Кастрычнік указаў нашым народам шлях да свабоды і шчасця, даў ім дзяржаўнасць і права заняць «пачэсны пасад між народамі». У снежні 1917 года была абвешчана Украінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Пазней, крыху болей чым праз год, паўстала Савецкая Рэспубліка беларускіх рабочых і сялян. З тае пары ўкраінскі і беларускі народы, пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа і іншых народаў нашай краіны, упэўнена і пераможна ідуць да вялікай мэты — камунізма.

Савецкая Украіна адзначае свайго паўвеку. А свята Украіны — свята Беларусі. Беларускі народ сардэчна віншуе сваіх братоў-украінцаў з вялікім святам. Гарачыя прывітанні і шчырыя пажаданні поспехаў украінскім калегам шлюць беларускія пісьменнікі, мастакі, кампазітары, работнікі тэатраў і кіно, дзеячы навукі і культуры.

Са святам, дарагая старэйшая сястра Украіна!

Матэрыялы, прысвечаныя 50-годдзю Савецкай Украіны, чытайце на 3-й стар.

УСІМІ ФАРБАМІ ЖЫЦЦЯ

Ю. ПУЧЫНСКІ

ПАСПРАБУЙЦЕ ўявіць на імгненне такое: прырода, якая акружае нас, людзі, дамы—усё раптам памяняла колер. Зніклі, скажам, зялёныя, сінія, жоўтыя фарбы. Няма больш сінявы неба, зялёнага паўзмроку лесу, залатой восені. Нас акружаюць толькі чырвоныя, чорна-чырвоныя, шэра-чырвоныя і белыя таны. У іх афарбаваны чэрвеньскі луг і сцены будынкаў, яблыневы сад і адзенне людзей, машыны на вуліцах і месяц на небе. Паветра больш не ўплывае на паветраную перспектыву, знікла лінейная перспектыва, блізкія прадметы здаюцца карлікавымі, далёкія — гігантамі.

Ці падабаецца вам гэты нязвычны, пануры свет? А я ж яго не выдумаў. Ён існуе не на аддаленых ад нас на тысячы светлавых гадоў планетах, якія выдумляюць фантасты, а на палотнах некаторых сучасных мастакоў, якія штучна выхалашчваюць зямную прыгажосць, зводзяць яе да нейкай наўмыснай каляровай гамы, да сумы механічных прыёмаў, называючы гэта «сучаснай» мовай жывапісу.

У гэтых мастакоў імкненне да экстравагантнасці іншы раз бывае мацнейшым за здаровы сэнс. І яны імкнуцца адысці ў сваіх карцінах ад каляровай мнагастайнасці свету, ігнаруюць мнагастайнасць, спрабуюць падагнаць свет пад той або іншы стандарт, які ім падабаецца. На мастацкіх выстаўках мы нярэдка бачым шэрых людзей на шэрай зямлі на фоне чорнага неба. Такія мастакі выкарыстоўваюць любы колер. Да прыкладу, выкананы чорнай грызайлю малюнак «абмочваюць» у чырвоную фарбу і— каларыт гатовы. Тое ж самае робяць з сінім, зялёным і іншымі колерамі. Гэта я кажу напаўжартам, напаўсур'ёзна, але мне здаецца, што я недалёкі да ісціны. За невялікім выключэннем на нашай юбілейнай рэспубліканскай выстаўцы большасць работ манахромныя, аскетычныя па колеры. І некаторыя з іх займалі, так сказаць, цэнтральнае месца, стваралі ўражанне змрочнасці і жорсткасці.

Такое, так сказаць, вузкае вырашэнне каларыстычнай задачы робіць нашы апошнія выстаўкі даволі аднастайнымі. Але сёй-той з мастакоў і мастацтвазнаўцаў спрабуе падвесці пад гэта тэарэтычную базу. Яны сцвярджаюць, што сучасны стыль павінен, маўляў, развівацца толькі па лініі сцісласці, манументальнасці выразных сродкаў, па лініі эканамічнасці мастацкіх задач. Я нічога не маю супраць лаканізму, сілуэтнасці, эканомнага вырашэння. Ёсць тэмы, якія інакш і не вырашыць. Але...

Гэты набор якасцей «сучаснага» стылю ні ў якім разе нельга прыняць за канон. Што загадаеце рабіць тады з такім жывапісцам, як П. Канчалоўскі? Яго жывапіс заснаваны на любоўным вывучэнні прыроды, на выкарыстанні тонкіх танальных вібрацый, на багацці палітры, на ўменні адчуваць і перадаваць цудоўную плоць свету. А як быць з выдатнымі пейзажамі Стажарава, якія на любой выстаўцы глядзяцца з большым задавальненнем, чым іншыя палотны, з якіх «выпампавана» паветра, а каларыт нагадвае каляровую лінагравюру? Яны што —састарэлі ўжо?

Мы часта спрачаемся аб тым, што такое сучаснае ў мастацтве. І вельмі часта паняцце сучаснага зводзім да фармальных прыкмет: лаканізм, графічнасць, экспрэсія. Дарэчы, аб экспрэсіі. Кажуць, што яна выказвае дынамізм нашага веку. Але чаму паступова, разам з паветрам і святлом, з жывапісу некаторых мастакоў знікае і рух — аснова экспрэсіі?

Мне здаецца, ларчык адкрываецца проста. Некаторыя лічаць так: усё, што рухаецца, — ілюстрацыйнае, а ілюстрацыйнасць у жывапісе, як вядома,— смяротны грэх. І невыпадкова на большасці палотнаў так званага «мадэрнавага» плана людзі або стаяць, або сядзяць, а калі і рухаюцца, дык франтальна, важна і ўрачыста, амаль без жэстаў, бо лічыцца, што жэст — з галіны пантамімы, а пантаміма — элемент тэатральшчыны...

Якіх толькі тэорый не выдумляюць! І гэтага таму-сяму аказваецца даволі, каб з пагардай гаварыць нават аб карцінах Дэлакруа, дзе ўсё ў руху, аб палотнах Сурыкава. Мейсанье і многіх іншых. Іх абвінавачваюць у тэатральшчыне, фатаграфізме. Парадаксальна— сумежныя віды мастацтва служаць для некаторых мастакоў крыніцай пагардлівых ярлыкоў!

Адмяжоўваючыся ад фатаграфіі, мы адмаўляемся ад ракурсаў, адмяжоўваючыся ад літаратуры, мы страцілі нешта надзвычай каштоўнае — эфект суперажывання. І я абсалютна згодны з думкамі М. Заборава, які ў артыкуле «Падказана жыццём і... рэпрадукцыямі» («Літаратура і мастацтва» 1 снежня г. г.) выступіў супраць самалюбівай крыклівасці некаторых «наватараў». Я перакананы: гэтыя наватары не разлічваюць, што глядач будзе суперажываць. Ім важна іншае — хоць на секунду, але здзівіць калі не масавага гледача, то хоць бы тых, хто пастаянна мяркуе аб творах мастацтва ва унісон з модай.

Мала таго, што паняцце «сучаснасць» тлумачыцца часта толькі па суме фармальных прыкмет, часта яго проста падмяняюць паняццем «мода». А для мастацтва няма нічога больш згубнага, чым бяздумна прытрымлівацца моды.

Са сказанага не вынікае, што можна адмаўляць каларыт як сродак выразнасці ў жывапісе. Не. Важна другое — наколькі ён дапамагае раскрываць тэму. Ёсць карціны, якія нават бываюць «заквашаны» на каларыце, які адпавядае тэме. І ўсё ж яны «страляюць» міма.

Чаму? Таму, што скупасць, каляровы аскетызм плюс адназначнасць псіхалагічнай характарыстыкі абарочваюцца холадам і раўнадушшам да выбранай тэмы. Так я ўспрыняў, напрыклад, карціну Г. Вашчанкі «Ад Савецкага Інфармбюро». Колеравая збяднеласць адчуваецца і ў апошніх работах В. Сумарава і некаторых іншых маладых мастакоў.

Захапляючыся тымі або іншымі вузка прафесіянальнымі задачамі, некаторыя майстры не імкнуцца шырока асэнсоўваць жыццёвыя з'явы. Колькі разоў мы ў захапленні паўтараем: «Ах, якая лінія! Ах, якая пляма!», а праходзім міма вялікіх жыццёвых праблем мастацтва. Колькі было «дзяўчат у полі», «бадзёрых шахцёраў», «уборак бульбы», бедных па думцы, убогіх па ідэях. Дзесяткі гадоў мы бачылі бясконцыя, уяўна-значныя варыянты гэтых тэм, сустракаюцца яны, на жаль, і зараз. Але гэта чамусьці не дужа непакоіць саміх мастакоў і членаў выстаўкома.

Гэтая мая заўвага датычыцца і графікі, дзе «папараць» і «грыбы», стылізаваныя кветачкі выдаюцца за адкрыцці. А Чахонін жа гэта рабіў яшчэ сорак гадоў назад нікольні не горш за сучасных мастакоў.

З'яўленне такіх твораў на нашых выстаўках, мне здаецца, звязана з няправільным метадам работы нашых выставачных камітэтаў. І аб гэтым напярэдадні з'езда мастакоў Беларусі трэба гаварыць на поўны голас. Кожнаму мастаку хочацца, каб яго работа ацэньвалася па вялікаму рахунку. І тут першая інстанцыя — выстаўком. Але даводзіцца з засмучэннем гаварыць аб тым, што ад выставачнага камітэта мастак надзвычай рэдка можа пачуць сяброўскую параду. Абмеркаванне работ адбываецца чамусьці пры зачыненых дзвярах, а калі аўтара нарэшце запрашаюць выслухаць рашэнне, то, часцей за ўсё, яно выкладаецца прыкладна так: «Выстаўком палічыў магчымым» або «Выстаўком не палічыў магчымым». Гранічны лаканізм! Творчая ж думка кампетэнтнага кола калег засталася там, за зачыненымі дзвярыма.

Немалаважны і той факт, што ў выстаўкоме пераважаюць мастакі аднаго «кірунку» і таму навязваецца часамі адна пэўная манера пісьма або вырашэння.

Мне думаецца, што выстаўком мог бы папярэдзіць многіх здольных мастакоў, якія працуюць па прынцыпу: «А як сёння пішуць?», ад мастацкага хамелеонства. Вельмі прыкра бывае за сталага майстра, які, дагаджаючы модзе, кожны год мяняе свой почырк. А. Малішэўскі вядомы як добры каларыст, ён нядрэнна кампануе, у лепшых работах уздымаецца да аналізу значных сацыяльных з'яў. Але амаль на кожнай новай выстаўцы ён — новы, яго нават не заўсёды пазнаеш. Пошук новага стылю адбірае ў мастака часам столькі творчай энергіі, што ў некаторых яго карцінах відаць **толькі** эксперымент. Многія аматары жывапісу ведаюць цудоўныя па каларыту паэтычныя карціны азербайджанца Джафарава. Успомнім хоць бы яго «Выбар бранзалета». А вось аднойчы я ўбачыў яго карціну «Металургі». Гэта палатно напісана па ўсіх «правілах» сучаснага стылю. Усё плоскасна, рытмізавана. Кампазіцыя моцная. І колер неблагі. І ўсё ж карціна халодная, бо новы прыём аказаўся для аўтара неарганічным.

[Заканчэнне на 4-й стар.]

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІІ ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

За вялікую работу па прапагандзе музычнага мастацтва ў рэспубліцы, ідэйна-мастацкаму выхаванню працоўных узнагародзіць Беларускую дзяржаўную ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонію Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. СУРГАНАЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Д. ЛУКАШЭВІЧ.

20 снежня 1967 года, г. Мінск.

ЦІКАВАЯ СТАРОНКА З ГІСТОРЫІ ТЭАТРА

У Доме мастацтва адбыўся вечар, прысвечаны 50-годдзю Першага беларускага таварыства драмы і камедыі. Створанае па ініцыятыве І. Буйніцкага, таварыства шмат зрабіла для развіцця тэатра ў Беларусі. На аснове таварыства быў створаны Першы Беларускі дзяржаўны тэатр — імя Янкі Купалы. У таварыстве пачыналі сваё творчае жыццё вядомыя майстры беларускай сцэны — І. Ждановіч, Л. Ржэцкая, С. Станюта, К. Саннікаў, А. Ільінскі, Г. Грыгоніс, М. Міцкевіч, К. Міронава і інш.

На вечары выступілі з успамінамі ўдзельнікі Першага беларускага таварыства драмы і камедыі Я. Рамановіч, С. Станюта, І. Ждановіч.

Вельмі цікавая ў беларускім тэатральным мастацтве фігура У. Галубка. Першы народны артыст БССР, стваральнік сапраўды народнага вандроўнага тэатра — Трэцяга дзяржаўнага тэатра—ён разам са сваёй сям'ёй быў актыўным удзельнікам таварыства. Артыст, мастак, рэжысёр, драматург, адміністратар — усе гэтыя якасці спалучаліся ў адной асобе Уладзіслава Галубка.

З цікавымі ўспамінамі выступілі дочкі У. Галубка — Багуслава і Вільгельміна, якія з маленства пачыналі сваё жыццё на сцэне разам з бацькам. З У. Галубком-мастаком пазнаёміў прысутных Я. Ціхановіч.

Д. СТЭЛЬМАХ.

ЛЕКЦЫІ-КАНЦЭРТЫ Ў КАЛГАСАХ

Па заснежаных дарогах Міншчыны едуць аўтобусы з музыкантамі. Круціць снежная завіруха. І раптам машына засела ў снезе. Але калгаснікі чакаюць сталічных артыстаў і насустрач ім выслалі трактар. Сустрэча адбылася.

Лекцыю «Беларуская музыка за 50 гадоў» прачытаў народны артыст БССР, прафесар І. Жыновіч. Ён падзяліўся таксама творчымі планамі Дзяржаўнага народнага аркестра БССР.

Пасля музыканты далі вялікі канцэрт. Народны аркестр выканаў творы беларускіх і савецкіх кампазітараў. У канцэрце прымалі ўдзел народны артыст БССР І. Сарокін, М. Галкоўскі, салісты філармоніі І. Адзінцова і В. Папова.

Дзяржаўны народны аркестр БССР ужо выступіў у Івянцы, Уздзе, Пухавіцкім раёне. Музыканты дадуць лекцыі-канцэрты ў Салігорску, Старобіне, Рудзенску.

УЗНАГАРОДА ЮБІЛЯРУ

У сувязі з 45-годдзем з дня выхаду першага нумара часопіса «Полымя», а таксама за актыўную прапаганду кнігі калектыў рэдакцыі часопіса ўзнагароджан Ганаровай граматай Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку і Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры з уручэннем яму медаля «450 гадоў беларускага кнігадрукавання».

Ганаровымі граматамі ўзнагароджана таксама група супрацоўнікаў рэдакцыі часопіса.

ЧАСОПІСУ «ПОЛЫМЯ»—45 ГАДОЎ

СТАРЭЙШЫ ЛІТАРАТУРНЫ...

Павел КАВАЛЁЎ, галоўны рэдактар часопіса «Полымя».

Гэта было ў снежні 1922 года. Краіна толькі пачынала залечваць цяжкія раны ваенных гадоў. Голад і холад яшчэ ўладарнічалі на вызваленай ад рознай, унутранай і замежнай, пошасці зямлі. Яркае сонца Вялікага Кастрычніка саграваю зямлю і натхняла людзей.

Вось тым часам і нарадзіўся першы ў нашай рэспубліцы літаратурны часопіс «Полымя», саракапяцігоддзе якога мы сёння адзначаем.

Ініцыятарамі арганізацыі і выдання часопіса былі народныя паэты Янка Купала і Якуб Колас, а таксама вядомы пісьменнік і дзяржаўны дзеяч Цішка Гартны, які стаў першым рэдактарам «Полымя». Партыя адразу ж падтрымала ініцыятыву вядомых пісьменнікаў, падтрымала і назву часопіса, якая была знакам рэвалюцыйнай пераемнасці, бо яна ўсім нагадвала вядомы дэвіз, пад якім выходзіла ленінская «Іскра»: «З іскры разгарыцца полымя».

Сёння, успамінаючы мінулае, мы можам з поўным на тое правам сказаць, што часопіс «Полымя» адпавядаў сваёй назве, што ён прайшоў свой саракапяцігадовы шлях разам з усёй краінай, крок у крок са сваім родным народам, што ён натхняўся і натхняў чытачоў неўмручымі ленінскімі ідэямі, змагаўся за новы свет, за новага чалавека, за мір і братэрства народаў.

Хочацца тут прыпомніць змешчаную ў першым нумары часопіса дэкларацыю, якой ён вызначаў свае задачы, як выдання літаратуры, палітыкі, культуры, эканомікі і публіцыстыкі: «Аформіць светапогляд беларускіх культурных працаўнікоў, прыцягнуць да беларускага культурнага будаўніцтва найбольш свядомыя і развітыя элементы з радоў беларускага пралетарыяту і бяднейшага сялянства... даць шырокую дарогу для выяўлення к жыццю тым беларускім пісьменнікам і паэтам, якім навявае мелодыі муза вызвалення працоўных грамадаў, муза калектыўнай творчасці іх»...

Часопіс «Полымя» многа зрабіў для развіцця нашай роднай беларускай літаратуры, якая стала цяпер адным з перадавых атрадаў магутнай савецкай літаратуры. Ён стаў трыбунаю пісьменнікаў і паэтаў, якія выйшлі з рабочых і сялянскіх мас і сваё мастацкае слова аддалі справе народнай. Летапіс жыцця беларускага народа можна прасачыць па творах, апублікаваных за 45 год у часопісе «Полымя». Надрукаванае на яго старонках (раманы, аповесці, п'есы, паэмы, навуковыя і крытычныя працы) — жывое люстра шляху ўсёй беларускай літаратуры, яе развіцця, яе ўзлётаў і спадаў. Найлепшыя здабыткі нашай літаратуры цяпер добра ведаюць не толькі ў рэспубліцы, але і далёка за яе межамі.

Тут перш-наперш трэба назваць паслярэвалюцыйныя вершы і паэмы Янкі Купалы, вершы, паэмы, аповесці Якуба Коласа, творы Цішкі Гартнага і Міхася Чарота, раманы, аповесці, апавяданні Змітрака Бядулі, Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага, Платона Галавача, Міхася Лынькова, Эдуарда Самуйлёнка, байкі і п'есы Кандрата Крапівы.

Гэта ж на старонках «Полымя» ўпершыню паявіліся, а потым шырока пайшлі ў свет такія творы нашай пасляваеннай літаратуры, як «На ростанях» і «Рыбакова хата» Якуба Коласа, «Векапомныя дні» Міхася Лынькова, раман «Калі зліваюцца рэкі», паэмы і вершы Петруся Броўкі, раманы «Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні», аповесці «Трывожнае шчасце» Івана Шамякіна, раманы «Мінскі напрамак», «Людзі на балоце» і «Полых навальніцы» Івана Мележа, паэмы і лепшыя вершы Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Пятра Глебкі, Максіма Лужаніна, Кастуся Кірэенкі, Анатоля Вялюгіна, Сяргея Дзяргая, Міколы Аўрамчыка, раманы «Су-

[Заканчэнне на 2-й стар.].

Тэатр

РАМЯСТВО... АБО ГЕРБАРЫЙ НА ЎСЕ ГУСТЫ

Практыка тэатра дае розныя прыклады з'яўлення новых драматургічных імёнаў. У тым ліку і такія, калі і не ведаеш, ці добра гэта, што аўтар ужо ў дэбюце выступае знаўцам рамяства — ведае, **як гэта робіцца.**

Анатоль Дзялендзік ведае ўжо не толькі адно гэта. Яго другая п'еса — драма «Грэшная любоў», якую нядаўна паставіў у Брэсце тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі, сведчыць, што малады аўтар авалодаў няпростым «механізмам поспеху», добра ўсвядоміў, чым можна «ўзяць» глядзельную залу. Я не агаварыўся: менавіта ўсю залу, а не асобных гледачоў. Даволі ўмела будуе ён на меладраматычных сітуацыях займальны сюжэт, размяркоўвае дзеючых асоб па пасадах зусім станоўчых, станоўчых з якімнебудзь «мінусам» і асуджаных на пакуты за свае ж уласныя памылкі. Сутычкі паміж імі ў «Грэшнай любві» адбываюцца самыя разнастайныя — ад жартаўлівай рэўнасці да барацьбы дыяметральна розных поглядаў на чалавека ў абставінах вайны. Словам, тут ёсць што паглядзець людзям з самымі рознымі густамі. І калі, скажам, адна частка залы пачынае сумаваць ад слязліва-сентыментальных перажыванняў персанажаў, дык другая ў гэты час сочыць за ўсім з прытоеным дыханнем: потым аўтар прымушае каго-небудзь са сваіх герояў паглыбіцца ў «інтэлектуальныя» разважанні — і пачынае ажыўляцца першая частка залы, а для другой настае час трошкі пасумаваць. Робіцца гэта А. Дзялендзікам з дакладным адчуваннем запатрабаванняў сцэны і залы, у імклівым тэмпе, часам вынаходліва — таму адразу і не заўважаеш прыкрыя «белыя ніткі», якімі падагнаны адзін да аднаго розныя матывы драмы.

Але не ў «нітках» справа. Добра вывучыўшы **правілы жанру**, дзейснасць якіх пацвердзіў поспех яго першай п'есы «Чатыры крыкі на сонцы» («Выклік багам» і «Паядынак» — назвы той жа самай п'есы ў розных тэатрах), А. Дзялендзік пакуль што не вывучыў **законаў мастацтва.** А гэтыя законы прадугледжваюць кожны раз новыя шляхі ўвасаблення жыццёвага зместу ў мастацкую форму.

...Прамень святла па-кінематаграфічнаму выхоплівае «буйным планам» твар сківелага мужчыны. Адразу пазнаём у ім ветэрана вайны. Гэта — былы камандзір партызанскага атрада Зубовіч (арт. М. Абрамаў). Ён пачынае ўспамінаць выпадак чвэрцьвекавой даўнасці і з нейкім устрывожаным пачуццём пытаецца: «Чаму я не магу гэтага забыць?...»

Значыць, драма «Грэшная любоў» і адкажа нам, **чаму** менавіта **гэтага** нельга забываць і нам. Калі па-вучнёўску паспрабаваць вызначыць тэму спектакля, дык яна, бадай, амаль што цалкам ахопіць сутнасць падзей, якія адбываюцца на сцэне. Хай даруюць мне А. Дзялендзік і рэжысёр Г. Баравік, але я і зраблю гэта, як нас вучылі яшчэ ў школе: спектакль «Грэшная любоў» — гісторыя здрады, на якую пайшла партызанская сувязная Крысціна, каб выратаваць узятага фашыстамі ў заложнікі сына Івана. Аўтар і тэатр могуць запярэчыць — і не без падстаў,— што на падмостках адбываюцца падзеі і вядуцца размовы, якія выходзяць за рамкі вось так вызначанай тэмы. Але, вядуцца. Ды яны служаць толькі фонам да той даволі прымітыўнай меладраматычнай сітуацыі, пра якую я сказаў.

Сапраўды, напрыклад, у чацвёртай карціне паміж камандзірам атрада Зубовічам і начальнікам асобага аддзела Монічам узнікае нешта накшталт спрэчкі. Першы з іх з дакорам гаворыць другому — «Не атрымліваецца з настаўніка начальніка асобага аддзела», — каб той адкінуў свае так званыя «інтэлігенцкія» сумненні і прыняў адзіна вернае ва ўмовах вайны рашэнне. Пачынае гучаць новы матыў драмы, рэчышча падзей збочвае і...

«Я іншы раз думаю — калі б Чэхава, Антона Паўлавіча, на маё месца... Смешна», — разгублена-іранічна гаворыць арт. Ю. Уласаў, адрасуючы свой тэкст не столькі партнёру па сцэне, колькі глядзельнай зале.

Як быццам бы і арыгінальна — Чэхаў і раптам «асабіст»! Можна, вядома, закрануць і такую парадаксальную думку, але, як спытаў бы той жа Антон Паўлавіч: «Можна, ды ці трэба?». Бо характар начальніка асобага аддзела Барыса Моніча ў п'есе «Грэшная любоў» не вымагае такога ходу разважанняў. Відаць, гэты мужчына 30-ці гадоў у свой час праходзіў службу ў армейскіх радах і рыхтаваў сябе да сапраўднай вайны, а тут чамусьці пачынае выглядаць гэткім інтэлігентам «наогул» і з пакутлівым уздыхам паказвае на кнігу: «Я вось класікаў імкнуся захаваць... Не ведаю, як я дзеткам пасля вайны... Ці здолею пасля ўсяго, што бачыў...» У процілегласць Ю. Уласаву артыст М. Абрамаў у сваім герое (Зубовіч, камандзір атрада) настойліва падкрэслівае рысы заўзятага салдафона («Перамога... любой цаной, любымі сродкамі! Не здабудзем — не будзе каму весці размовы пра чулыя адносіны, пра мараль і гуманізм...»)

Пагаварылі прыблізна вось так камандзір з «асабістам» — і зноў спектакль вяртаецца на меладраматычныя рэйкі. Стрымана і пакутліва любіць партызана-дэсантніка Паўла дачка Зубовіча Ганна (арт. Ж. Зарэмба). Яна просіць, каб бацька дазволіў ёй разам з Паўлам пайсці на рызыкоўную дыверсію, бо толькі гераічным учынкам гэты хлопец можа змыць з сябе ганебную пляму: ён паведаміў Крысціне пра баявую аперацыю партызан. Зноў — грэшная любоў дачкі камандзіра да яго падначаленага, які да таго ж закаханы ў Крысціну. Аматары падобных «трохкутнікаў» у зале зноў пачынаюць перажываць, «інтэлектуалы» — усміхацца.

Здрада... Двойчы партызан Павел спрабуе зразумець каханую жанчыну — чаму яна пайшла на ганьбу і служыла нейкаму каменданту (дарэчы, ні адзін прадстаўнік з «таго» боку на сцэне ўвогуле не з'яўляецца). Дыялогі напісаны А. Дзялендзікам і сыграны артыстамі В. Пестуновым і Т. Камбуравай напружана і эмацыянальна, кожная рэпліка — нібы чарговы доказ віны або контрдоказ. І тэатр прымушае залу часам... ну, калі не дараваць Крысціне яе злачынства, дык, прынамсі, «уваходзіць у яе становішча».

З болем у сэрцы стрымлівае крык Крысціна — Камбурава: «Радзіма для мяне — Ванюшка...» Павел адводзіць свой позірк убок і прымушае сябе сказаць гэтай жанчыне словы, якія не могуць быць пераканаўчымі ні для яе, ні для яго самога: «Сын — і Дамарад, сын — і Максімчык, сын — і Грынь...» Зноў пратэст Крысціны: «Яны мне чужыя!» Артыстам неверагодна цяжка знаходзіць натуральныя інтанацыі ў гэтым паядынку, бо ў пэўнай ступені тут перамагае... здрадніца. І мы, гледачы, таксама не паспелі як мае быць адчуць сімпатыі да зусім эпізадычных, другарадных персанажаў Дамарада, Максімчыка і Грыня, і нават іх пагібель — за кулісамі — не кранула нас з той мерай **эмацыянальнага ўздзеяння,** як падрабязна і артыстычна пераканальна паказаныя пакуты тых, хто былі прама ці ўскосна вінаваты ў іх смерці, — Паўла і Крысціны.

Між іншым, меладраме ўласцівы падкрэслена эмацыянальная ўзнёсласць і амаль абавязкова маральна-павучальная тэндэнцыя. Няўжо, тэатр цалкам пагадзіўся з аўтарам, калі сцвярджае на сцэне магчымасць хоць кароткага, але спачування... здрадніку? Ці і яго захапіла думка накшталт той, што ўсялякая любоў на вайне — грэшная?..

Дзіўная рэакцыя глядзельнай залы ў адным месцы гэтага дыялогу, як мне здаецца, павінна была б насцярожыць тэатр і драматурга. Амаль страціўшы надзею апраўдацца перад каханым і гледачамі Крысціна—Камбурава з адчаем і ціхага вар'ята гаворыць: «Млын... Суцэльны млын... і людзі — зерняткі пад жорнамі...» Сентыментальна настроеныя гледачы дастаюць хустачкі: зараз на іх вачах загіне вось такое «зернятка». Але і Павел, як гэта пранікнёна перадае арт. В. Пестуноў, таксама адчувае сябе такім жа бяссільным перад жыццём-млынам, як ...і Крысціна: «Дробяцца пад жорнамі цвёрдыя зерні, мякчэйшыя праходзяць...» Я быў на спектаклі, калі большая частка гледачоў у гэтым месцы была схільная падзяляць безнадзейна-прымірэнчую «філасофію» прыведзеных рэплік.

Ветразь канфлікту валачэ спектакль, але — куды і чаму? Гледачы ведаюць з самага пачатку, што па законах ваеннага часу здраднік будзе пакараны, і сочаць за падзеямі толькі чакаючы: **няўжо** «ёй» даруюць, няўжо ёсць такая магчымасць!

Вышэй я казаў, што аўтар умела размеркаваў сваіх персанажаў па «пасадах». Але мушу дадаць, што нават самыя станоўчыя з іх — гэта людзі з комплексам непаўнацэннасці. Калі чытаеш тэкст драмы, гэта яшчэ не асабліва кідаецца ў вочы. На сцэне ж ушчэрбнасць характараў робіцца відавочнай. Асабіст Моніч выконвае свае абавязкі, пазіраючы на самога сябе і на ўсе падзеі праз... чэхаўскае пенснэ. Камандзір атрада не можа адмовіць дачцы ў яе хадайніцтвах за Паўла, бо куды падзенеш бацькоўскую любоў да гэтага дзяўчаці, якую ён нядаўна яшчэ «рэмнем лупіў». Павел фатальна закаханы ў замужнюю жанчыну, адрокся ад яе, калі даведаўся, што яна здрадзіла, і цяпер самаахвярна ставіць сабе вышэйшай мэтай выратаваць яе сына-заложніка. Ганна Зубовіч не знаходзіць у сабе сіл, каб пераадолець пачуццё да Паўла, хоць ён і не хавае свайго «грэшнага кахання» да іншай...

Усё гэта ўпрыгожана і аздоблена прэтэнзіяй на арыгінальныя характары. Слова ў вуснах дзялендзікавых герояў не стала спосабам іх мыслення, а застаецца толькі сродкам абгрунтавання намераў і ўчынкаў ды для пабочных сентэнцый. Напрыклад, калі Зубовіч даведваецца пра тое, што яго дачка любіць Паўла, а той у сваю чаргу Крысціну, ён гаворыць начальніку асобага аддзела: «Мне здаецца, яна старэйшая за Паўла...» — М. Абрамаву ў гэтым месцы трэба іграць заклапочанага бацьку, які асуджае суперніцу дачкі. «Бальзак таксама аддаваў перавагу сталым жанчынам, — глыбокадумна парыруе Моніч, так і не ўдакладніўшы, дзе гэтак рабіў Бальзак — у жыцці або ў сваіх кнігах, і чамусьці дадае: — Глядзі, каб і да цябе не падаслалі паненку». Тут, канешне, «бацька» адыходзіць убок, і Зубовіч застаецца выключна «камандзірам»: «Без паненкі я магу пражыць, А без павагі з боку байцоў...»

Шчыра кажучы, было няёмка за артыстаў, калі яны былі павінны ўсур'ёз «ажыўляць» падобнае і ўсур'ёз шукаць тут падтэкст. І не таму, што партызанскаму важаку накшталт Зубовіча «не паложана» каламбурыць ці жартаваць на гэткім узроўні — не. Падобным чынам не ствараюцца **характары.** Перамешаныя ў тэксце то празмерна слязлівыя эпізоды, то шматзначныя дыялогі з наўмысна зробленымі «перакідамі» ў нашы дні (у адказ на парадаксальную сентэнцыю Моніча — «Святыя пачуцці маці робяцца ў вайну злачыннымі...» — стары Зубовіч хмурыць бровы і з надзеяй глядзіць у партэр залы: «Пасля вайны нас у нечым не зразумеюць...»), то заблытаныя спрэчкі, калі і не ведаеш, чыя тут праўда, — усе яны складаюцца ў меладраматычную блытаніну.

Прызнаюся, мяне засмуціў другі крок А. Дзялендзіка на ніве літаратуры для тэатра. І не таму, што ён абраў меладраму як галіну сваіх творчых інтарэсаў (добра было б, каб гэты аўтар засвоіў законы **мастацтва** меладрамы). Яго «Грэшная любоў», на маю думку, належыць да тых спрытна зробленых рэчаў, дзе рамесніцкія прыстасаванні выглядаюць нават у нечым «свежымі», а кансерватызм жанравых асаблівасцей штучна падганяецца пад надзённыя запатрабаванні гледачоў. І артысты раз-пораз знаходзяць у асобных сцэнах «што іграць». І іграюць — як напісана: Т. Камбурава не без афектацыі узнімаецца да трагедыі, падкрэслівае лірычную задумёнасць у ролі Ганны Ж. Зарэмба, адцяняе характарнасць Ю. Уласаў, цудоўна пераўвасабляецца ў бабулю Алімпію з яе блытаным беларуска-польска-рускім гаворам маладая актрыса І. Фядотава, няўрымслива паводзіць сябе партызан Франэк (арт. К. Перапяліца), душэўную чысціню раскрывае Р. Сёмічава ў хлопчыку Ванюшы...

Мабыць, рэжысура і выканаўцы добра адчулі, як А. Дзялендзік наперад угадвае рэакцыю глядзельнай залы: для смеху і для абсалютнай цішыні ў спектаклі дакладна разлічаны паўзы, змены рытмічнага малюнку дзеі, патэтычныя месцы. Але...

А ці няма тут надакучлівай у апошнія часы «разбежкі» — у ацэнках рэцэнзента і гледачоў, якія выказваюць свае меркаванні «нагамі» — ідуць на «Грэшную любоў»? Магчыма. А. Дзялендзік і тэатр спашлюцца на касавы поспех спектакля ў Брэсце і абзінавацяць нас у прадузятым падыходзе да гэтага твора. Магчыма, сваім артыкулам я балюча пакрыўджу аўтара, хаця ён, мне здаецца, — з тых маладых, каго пакуль што, відаць, задавальняе феерверк часовых поспехаў і выпадковых апладысментаў. Але павінен жа ён звярнуць увагу на тыя відавочныя **намаганні** тэатра, што былі накіраваны на пераадоленне меладраматычных стогнаў у п'есе! Якая вынаходлівасць спатрэбілася рэжысёру Г. Баравіку, каб хоць у нейкай ступені наблізіць да гледачоў групу загінуўшых з-за здрады Крысціны партызан: кінематаграфічны прыём «наплыву», настойлівыя паўторы «іхняй» песні і, нарэшце, мастацкае «ажыўленне» іх, — усё гэта зроблена ў тэатры дзеля **выратавання** драматургічнага матэрыялу.

Мне давялося гутарыць наконт усяго, што тут напісана, з галоўным рэжысёрам тэатра Георгіем Волкавым. «Ведаеш,— сказаў ён, — падтрымаць парашутыста ў час другога скачка бывае куды больш патрэбна для яго і для агульнай справы, чым пры першым. Так і з Анатолем Дзялендзікам. Каб мы адмовіліся ад яго «Грэшнай любві», магчыма, не было б далейшых творчых пошукаў, і мы згубілі б здольнага драматурга. Пачакаем, што ён цяпер прыняце — ці рамесніцкае?.. Мы верым у аўтара, здольнага бачыць, дзе з-пад яго пяра ідзе сапраўды драматургія, а дзе... гербарый эпізодаў і асоб. Бы і для тэатра такі вопыт у галіне сучаснай меладрамы — павучальны...»

Трэба спадзявацца, што і на самой справе А. Дзялендзік і тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі будуць цяпер лепш адрозніваць жыццёва-творчую драматургію ад таго, што нязграбна скроена ды лоўка сшыта. Бо поспех чакае тыя творы для сцэны, якія адлюстроўваюць у вобразнай форме з'явы рэчаіснасці «ў іх бегу, у іх канфліктах і высновах або прагнозах, што адсюль вынікаюць» (А. Луначарскі). Рамесніцкая вытворчасць п'ес на «ўсе густы» нічога агульнага з мастацтвам не мае.

Барыс БУР'ЯН.

АКЦЁРЫ І РОЛІ

ГАСПАДЫНЯ НІСКАВУОРЫ, ЯЕ ЗАЙЗДРАСЦЬ І БОЛЬ

Спектаклю многа гадоў. Ён ідзе ў дэкарацыях, беднасць, выпадковасць і неахайнасць якіх, шчыра кажучы, не да твару такому аўтарытэтнаму творчаму арганізму, як Рускі драматычны тэатр імя М. Горкага.

Спектаклю многа гадоў. Сярод сталых яго гледачоў вельмі многа такіх, хто бачыў яго гадоў восемдзевяць назад, і цяпер, знаёмячыся па праграмцы са спісам дзеючых асоб і выканаўцаў, радуецца, што ў спісе гэтым з часу даўняй прэм'еры адбыліся не такія ўжо вялікія змены...

Спектаклю многа гадоў. Падзеі п'есы табе добра вядомыя, сцэнічнае ўзнаўленне іх у гэтай пастаноўцы—таксама. І тым не менш, стаіўшы дыханне, баючыся прапусціць хоць слова, ты сочыш за драмай, што скалянула каменнае гняздо Ніскавуоры, нібы ўпершыню. А пасля выходзіш з залы з тым трапяткім пачуццём, якое нараджае толькі сустрэча з сапраўдным, высокім мастацтвам.

Усё-такі якое гэта свята для тэатра—сустрэча ў сваёй рабоце з творам драматургіі, без усялякіх скідак вартым дадзенага ёй В. Бялінскім вызначэння вянца літаратуры. Сустрэча, і давесці, што на сустрэчу гэтую меў творчае права.

У сучаснай драматычнай літаратуры знойдзеш не так ужо і многа вобразаў, роўных па маштабнасці характару старой гаспадыні Ніскавуоры з п'есы фінскай пісьменніцы Хелы Вуалійокі «Каменнае гняздо».

Той, хто бачыў спектакль па гэтай п'есе на сцэне Рускага драматычнага тэатра—дзякуючы намаганням артыстаў-энтузіястаў пасля доўгага незаслужанага забыцця ён адноўлены ў рэпертуары,—той не зможа цяпер уявіць Старую гаспадыню Ніскавуоры інакшай, чым убачыла і паказала яе народная артыстка рэспублікі Ганна Браніславаўна Абуховіч. Вось сапраўды работа этапная і ў біяграфіі актрысы, і ў біяграфіі тэатра. Вось работа, якую трэба як узор паказваць маладым і якую ў поўным сэнсе слова можна назваць творчым подзвігам.

Апора, увасабленне непахіснасці муроў заможнай сядзібы і яе замшэлых законаў і звычаяў, Старая гаспадыня яшчэ больш—ахвяра гэтага свінцовага царства цемры. Як бы дзве сюжэтныя лініі паралельна разгортваюцца перад гледачом. Адна, акрэсленая падзеямі, што адбываюцца на сцэне: каханне Ілоны і Аарнэ, пранікненне свежага ветру ў непарушны спрадвеку лад Ніскавуоры. І другая, нябачная, што адбываецца ў глыбіні сэрца Абуховіч—Старой гаспадыні: усведамленне разумным, мудрым, на колькі галоў вышэйшым за навакольнае асяроддзе чалавекам, што жыццё пражыта не так, што вартаваў, адстойваў увесь свой век асуджанае на пагібель.

Уражваюць вочы Старой гаспадыні, калі глядзіць яна на Ілону Алгрэн. Спачатку ў іх крыху смяшлівая паблажлівасць да маладой жанчыны, якая спадзяецца зрушыць, стагоддзямі спрэсаванае каменнае гняздо—маўляў, ну, ну, падрыгайся, памітынгуй па маладосці гадоў,—самі былі такія, самі на нешта спадзяваліся, а бачыш, у што ператварыліся... Потым—здзіўленне, зайздрасць: гэта ж і я магла быць такою, калі б хапіла волі і мужнасці, калі б не скарылася Ніскавуоры... І нарэшце — гонар і боль. Гонар за тое, які выдатны чалавек увайшоў у жыццё яе сына. Боль за сябе, за тое, што самой засталося ўжо адно — цягнуць, вартаваць, аберагаць Ніскавуоры...

У «Каменным гняздзе» не адна акцёрская ўдача. Да гонару выканаўцаў роляў Ілочы (І. Лакштанава), Аарнэ (Ю. Сідараў), Сандры (В. Краўчанка) трэба сказаць, што яны выступаюць вартымі партнёрамі такога майстра, як Г. Абуховіч.

Г. Абуховіч у ролі Старой гаспадыні Ніскавуоры.

Фота Ул. КРУКА.

Прыемна таксама адзначыць сам факт аднаўлення на афішы Рускага тэатра спектакля, які нагадвае пра яго ранейшыя лепшыя дні, пра тое, якія вялікія патэнцыяльныя магчымасці мае калектыў, што ідзе сёння, на жаль, далёка не самай цікавай твочай дарогай.

Ул. МЕХАЎ.

ЯК ПЕСНЮ СКЛАСЦІ...

У клубе Саюза пісьменнікаў БССР адбылася сустрэча кампазітараў з паэтамі. У выкананні салістаў тэатра оперы і балета, філармоніі і радыё былі паказаны песні, напісаныя беларускімі кампазітарамі ў апошні час. Прагучалі творы Г. Вагнера, Я. Глебава, І. Кузняцова, І. Лучанка, У. Алоўнікава, Ю. Семяняки, Д. Смольскага, Я. Цікоцкага. Э. Тырманд, М. Шнейдэрмана. Паміж паэтамі і кампазітарамі ўзнікла шчырая гаворка аб шляхах развіцця песні. У ёй прынялі ўдзел В. Вітка, І. Сарокін, Г. Бураўкін, А. Ставер, С. Грахоўскі, Э. Тырманд, А. Бачыла, Я. Цікоцкі, С. Шушкевіч, Р. Шырма.

Удзельнікі сустрэчы адзначалі, што за апошні час з'явілася шмат добрых песень. Масавых, аднак, яшчэ мала. Нярэдка кампазітары выпрыстоўваюць недастаткова цікавыя, непаэтычныя тэксты. У мелодыі не заўсёды адчуваецца нацыянальны каларыт, што шмат чым нівеліруе музыку.

Кампазітары і паэты гаварылі аб неабходнасці далейшага ўмацавання кантактаў, аб карысці сумесных сустрэч і дыскусій.

З пошты АіМа

НІ ПОМНІКА, НІ КВЕТАК

Восенню я пабыў у вёсцы Крошын, што недалёка ад Баранавіч, на беразе маляўнічай Шчары. Мне захацелася пабачыць магілу Паўлюка Багрыма, які жыў у Крошыне і пахаваны там.

І вось я пытаюся ў мясцовых хлапчукоў, як знайсці магілу Багрыма. У адказ—здзіўленне-няведанне. Пытаюся ў старэйшых. Адна пажылая жанчына паказала, нарэшце, магілу паэта. Крошынцы старэйшага пакалення ведаюць пра Паўлюка Багрыма, пераказваюць скупыя звесткі аб яго жыцці і нялёгкім лёсе.

У гады вайны землякі паэта зберагліі люстру, якую калісьці зрабіў Багрым для мясцовага касцёла: апусцілі яе ў раку, і там яна праляжала да вызвалення вёскі. Цяпер люстра зноў вісіць у касцёле, аднак пабачыць яе не проста: касцёл заўсёды замкнёны. Аддаць жа люстру ў Брэсцкі краязнаўчы музей крошынцы не хочуць—шкада развітвацца з дарагой рэліквіяй. А ці не варта стварыць хаця б невялічкі школьны музей у самім Крошыне? Аб гэтым маглі б паклапаціцца і школа, і пасялковы Савет. Дарэчы, мясцовай школе можна было б прысвоіць імя паэта.

А сама магіла. Пакуль што яна занядбана. Няма на ёй нават сціплага помніка. Не пасаджаны кветкі. Усё гэта трэба выправіць. Імя Багрыма дарагое ўсім беларусам, і трэба шанаваць памяць аб ім.

А. ФЕДАРУК,
аспірант інстытута эксперыментальнай батанікі.

МУЗЕЙ АДКРЫТЫ

Два гады на дзвярах старадаўняга палаца ў Гомельскім парку вісела невялічкая аб'ява — «Музей не працуе». Ішоў рамонт будынка. Але для навуковых супрацоўнікаў гэта быў час напружанай работы. Яны працавалі ў двух невялікіх пакоях абласной бібліятэкі. Тут нараджаліся новыя экспазіцыйныя планы, эскізы афармлення. Сюды прыходзілі старыя камуністы, былыя партызаны, школьнікі — прыносілі дакументы, фатаграфіі, цікавыя археалагічныя знаходкі.

Цяпер планы і задумы ўвасоблены ў экспазіцыях — Гомельскі краязнаўчы музей адкрыты. Праўда, не ўвесь: яшчэ ідуць работы ў вежы палаца, дзе размесцяцца аддзел мастацтва з карціннай галерэяй і аддзел савецкага перыяду. Левая ж частка будынка — аддзелы прыроды і дасавецкага перыяду — ужо прымае наведвальнікаў.

Пытаюся ў загадчыка аддзела прыроды Міхаіла Захаравіча Агеева:

— Што новага ў вашым аддзеле?

— Усё новае, — адказвае ён, — памяшканне, афармленне, экспанаты. З ранейшых экспанатаў засталіся, бадай, толькі некаторыя чучалы птушак і жывёл, але і яны цяпер размешчаны па-новаму. Над афармленнем экспазіцыі працавала група гомельскіх мастакоў — Я. Пакаташкін, М. Навіцкі, А. Васільеў, А. Каламіец, Ф. Грыгар'янц.

У аддзеле ярка адлюстраваны прыродныя багацці Гомельшчыны. Вялікая экспазіцыя прысвечана геалогіі — у ёй прадстаўлена нафта з скважын вобласці, карысныя выкапні.

Многа новага і ў аддзеле дасавецкага перыяду. Яго загадчыца І. Каранеўская расказвае:

— Такога аддзела раней у нашым музеі не было. У нас сабраны дакументы пра рэвалюцыйны рух на Гомельшчыне, пра дзейнасць бальшавіцкіх арганізацый. Афармлялі аддзел мастакі Б. Кузьмічоў і У. Вукалаў.

У адной з залаў зманціраваны інтэр'ер дарэвалюцыйнай сялянскай хаты, а побач узноўлены адзін з пакояў князя Паскевіча. Рэчы, мэбля і прадметы ўжытку і там і тут сапраўдныя, яны захаваліся да нашых дзён. Кантраст паміж гэтымі двума інтэр'ерамі відавочны.

Ідзём далей. Яшчэ дзве навінкі: выстаўка «З гісторыі нашага горада» — фатаграфіі знатных землякоў, малюнкі Віталія Букатага, мастака газеты «Раздавім фашысцкую гадзіну», які загінуў у гады вайны, дакументы; зала падарункаў — з розных краін свету прыйшлі яны ў Гомель.

— У нас сабрана звыш 56 тысяч экспанатаў, — гаворыць дырэктар музея І. Капоця. — Ёсць сярод іх нямала унікальных. Раней у музеі было пяць навуковых супрацоўнікаў, цяпер штат павялічыўся. Створаны новы аддзел масавай работы, які займаецца арганізацыяй экскурсій, перасоўных выставак, падрыхтоўкай лекцый і дакладаў. Навуковыя работнікі музея цесна звязаны з народнымі музеямі, юнымі следапытамі.

Асабліва многа новага будзе ў экспазіцыях, прысвечаных Кастрычніцкай рэвалюцыі, Вялікай Айчыннай вайне і пасляваеннаму будаўніцтву. У аддзеле мастацтва асноўнае месца зойме карцінная галерэя. Будуць паказаны палотны з калекцыі Паскевіча, карціны вядомых мастакоў-гамяльчан, творы нашых маладых жывапісцаў, графікаў, скульптараў...

Музей адкрыты. Сотні гамяльчан штодзённа знаёмяцца з ратнай і працоўнай біяграфіяй свайго роднага краю.

Д. ІСАКАЎ.

СТАРЭЙШЫ ЛІТАРАТУРНЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

стрэнемся на барыкадах» і «Серадзібор» Піліпа Пестрака, раман «Птушкі і гнёзды» і аповесць «У Забалоцці днее» Янкі Брыля, раманы «Світанне» і «Засценак Малінаўка» Аркадзя Чарнышэвіча, «Віленскія камунары» Максіма Гарэцкага, «На парозе будучыні» і «Гарадок Устронь» Міколы Лобана, «За годам год», «Вясенняя ліўні», «Нямігі крывавыя берагі» Уладзіміра Карпава, «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча, «Расстаёмся ненадоўга» Аляксея Кулакоўскага, дакументальныя аповесці «Руіны страляюць ва ўпор», «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» і «Тварам да небяспекі» Івана Новікава, кніга Максіма Лужаніна «Колас расказвае пра сябе», драматычныя творы Кандрата Крапівы, Кастуся Губарэвіча, Андрэя Макаёнка, Аркадзя Маўзона, працы крытыкаў і літаратуразнаўцаў Алеся Адамовіча, Нічыпара Пашкевіча, Рыгора Бярозкіна, Уладзіміра Калесніка, Янкі Казекі, Уладзіміра Юрэвіча, Генадзя Кісялёва, Рыгора Шкрабы, Анатоля Клышкі, нарысы Ігната Дуброўскага, Веры Палтаран і Янкі Сіпакова.

Пералік, як бачыце, доўгі, але далёка няпоўны. Я не назваў, відаць, шмат добрых твораў, і асабліва нашых маладых аўтараў.

Вельмі прыемна, што сярод пералічаных і непералічаных вышэй здабыткаў беларускай літаратуры, сярод твораў, якія ўпершыню былі надрукаваны на старонках часопіса «Полымя», многія атрымалі вышэйшую народную адзнаку — Ленінскую прэмію, Дзяржаўныя прэміі СССР і БССР, адзначаны прэміямі на многіх усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсах.

Гаворачы сёння аб гэтых, усім вядомых творчых дасягненнях, я не збіраюся ўтойваць і таго факта, што некаторыя творы, якія патрапілі на старонкі нашага часопіса, былі напісаны не на тым узроўні, якога патрабуе ад нас чытач. З усёй шчырасцю трэба адзначыць і самы вялікі недахоп часопіса: усё яшчэ мала на яго старонках твораў на сучасныя, надзённыя тэмы, твораў, якія б раскрывалі найбольш важныя з'явы сучаснага жыцця рэспублікі. Гэта разумее рэдакцыйны калектыў і рэдакцыйная калегія часопіса і яны зробяць усё, каб на старонкі «Полымя» перш за ўсё траплялі творы высокай ідэйнай і мастацкай якасці, прыкладуць усе намаганні, каб узняць культуру, баявітасць, актуальнасць, навуковасць часопіса.

Мы павінны прызнацца і ў тым, што не заўсёды выконваем свае абяцанні чытачам, што некаторыя дэклараваныя творы пераносяцца з плана аднаго года ў план другога, і за гэта мы просім прабачэння ў сваіх падпісчыкаў. Але, праўду кажучы, не заўсёды ў гэтым вінаваты рэдакцыйны калектыў. Часам нашы шаноўныя аўтары не ўкладваюцца ў абяцаныя тэрміны, а прыспешваць іх — значыць, па сутнасці, не клапаціцца аб якасці.

У надыходзячым 1968 годзе мы будзем актыўна рыхтавацца да 50-годдзя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Часопіс надрукуе новыя творы беларускіх літаратараў, над якімі яны зараз працуюць. Гэта будуць і раманы, і аповесці, і паэмы, і нарысы, і публіцыстыка. Назаву хоць бы некаторыя з іх: паэмы Максіма Лужаніна «Як нарадзіўся новы свет», Анатоля Вярцінскага «Заазер'е», Рыгора Барадуліна «Блакада» і Анатоля Вялюгіна «Чысты чацвер»; новы раман Івана Шамякіна з умоўнай назвай «Паядынак», «Новая аповесць» Алеся Асіпенкі, трэці раман Івана Мележа з яго палескай хронікі — «За асакою берег», аўтабіяграфічная аповесць Пімена Панчанкі і аповесць Васіля Быкава «Атака на світанні». Новыя празаічныя творы дапісваюць і дапрацоўваюць для «Полымя» Піліп Пестрак, Міхась Машара, Мікола Лобан, Антон Алешка, Уладзімір Караткевіч. Мяркуем таксама надрукаваць драму Кастуся Губарэвіча «Першы ўрок», новую камедыю Андрэя Макаёнка і гістарычную п'есу Івана Ісачанкі.

Як вядома, «Полымя» — часопіс не толькі літаратурна-мастацкі, а і грамадска-палітычны. На яго старонках выступалі і выступаюць па самых надзённых пытаннях кіраўнікі партыі і ўрада, прадстаўнікі навукі, дзеячы ўсіх галін культуры. У новым, 1968 годзе на старонках часопіса з'явяцца артыкулы, нарысы, успаміны, дакументы пра тое новае, з чым наша рэспубліка сустракае сваё слаўнае 50-годдзе.

Нядаўна значна павялічыўся аб'ём часопіса. Утвораны аддзел навукі і мастацтва, што дае нам магчымасць шырэй асвятляць самае важнае і цікавае ў працы нашых выдатных вучоных, у мастацкім жыцці рэспублікі.

Сёння варта таксама адзначыць, што часопіс ва ўсёй сваёй дзейнасці ніколі не замыкаўся ў вузка нацыянальныя рамкі. Ужо ў згаданым вышэй рэдакцыйным артыкуле падкрэслівалася, што «культурная работа працоўных грамадаў адной нацыянальнасці заўсёды звязана з культурным жыццём і работаю працаўнікоў другой нацыянальнасці» і што «без узаемнага ўплыву і супрацоўніцтва не можа быць правідловага культурнага развіцця».

Верны свайму інтэрнацыянальнаму абавязку, часопіс «Полымя» ніколі не пакідаў па-за ўвагай праблему сувязей братніх літаратур, праблему іх узаемаўзбагачэнняў, сачыў за прагрэсіўнымі з'явамі зарубежных літаратур. Нават у склад рэдкалегіі ўваходзілі такія вядомыя свету пісьменнікі, як Іяганес Бехер і Юліус Фучык. Цікава паведаміць такі факт: калі ў 1928 годзе ў Германіі ўлады забаранілі раман І. Бехера «Адзіна справядлівая вайна», часопіс «Полымя» арганізаваў пераклад рамана на беларускую мову і апублікаваў яго на сваіх старонках. Гэта было першае надрукаванне рамана вядомага пісьменніка-антыфашыста.

Руская, украінская, латышская, літоўская літаратуры прадстаўлены і будуць прадстаўляцца часопісам «Полымя» ў перакладах лепшых нашых пісьменнікаў. Тое ж самае трэба сказаць і адносна літаратур краін народнай дэмакратыі, а таксама маладых краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Такія раздзелы часопіса, як «Культура мовы», «Старонкі беларускай энцыклапедыі», «Успаміны, дзённікі, дакументы», «Перапіска з чытачом» і нават «Хроніка», калі рабіць іх цікава і ўдумліва (а мы іменна **так** і стараемся іх рабіць), будуць дапамагаць нашым чытачам пашыраць свой кругагляд.

Мы рады, што тыраж часопіса расце, а гэта значыць, што нам трэба і надалей чула прыслухоўвацца да голасу чытачоў, да іх думак, заўваг і прапаноў.

Мы разумелі і разумеем сваю задачу — дапамагаць партыі ў вялікай справе камуністычнага выхавання працоўных, дапамагаць чалавеку рабіцца лепшым і прыгажэйшым.

Гэтых трох хлопцаў добра ведаюць у Жыткавіцкім раёне. Актыўныя ўдзельнікі агітбрыгады раённага Дома культуры, мужчынскае вакальнае трыо частушачнікаў у складзе Васіля Нямчэні, Мікалая Гарбабы і Вячаслава Мікульскага часта выязджае на вёску, у калгасы і саўгасы свайго раёна.

Фота Я. КАЎГАНАВА.

УКРАІНА, ЦВЕЦЕ ЛЮБЫ, СОНЦАМ ГАДАВАНЫ...

Янка Купала

ПЯЮ ЦЯБЕ, ЗЯМЛЯ БРАТОЎ!

Пятрусь БРОЎКА

КАЛІ я думаю аб Украіне, я ўспамінаю мужны і слаўны, пявучы ўкраінскі народ, які жыве на шчаслівых прасторах зямлі, выпешчанай ласкавым сонцам, на зямлі, багатай і прыгожай, рознай па складу і фарбах, дзе бяскрайнія чарназёмныя стэпы і высозныя карпацкія горы, дзе славуціч Дняпро і шумліваe Чорнае мора. Чытаючы Гогаля, Шаўчэнку, многіх украінскіх пісьменнікаў, уяўляеш сабе і «садок вішнёвы каля хаты», і кучаравыя гаі, і белыя сялянскія мазанкі. Пяцьдзесят гадоў Савецкай Украіне... Многа новага ўвайшло і ў сам воблік украінскай зямлі і змяніла яе выгляд: і магутны Днепрагэс, і заводы прамысловага Харкава, Днепрапятроўска, Днепрадзяржынска, Луганска і Львова, і шахты Данбаса. На бязмежных стэпавых прасторах — трактары і камбайны...

Я пяю цябе, Украіна! З малых гадоў зачаравалі маё сэрца твае словы, твае песні, твая хвалююча музыка задумных бандур. Можа таму, што да слёз усхвалявалі яшчэ ў дзіцячыя гады вершы Тараса Шаўчэнкі, а пасля і вершы Купалы і Коласа, і самому захацелася пісаць.

Калі сёння думаю аб Украіне, успамінаю сваіх дарагіх сяброў — украінскіх паэтаў і пісьменнікаў. І старэйшых, у якіх давялося павучыцца, і равеснікаў, з якімі некалькі дзесяцігоддзяў побач дружна працуем, і маладзейшых, пос'леху якіх мы шчыра радуемся. З вялікім болем думаю аб адсутнасці ў дні слаўнага пяцідзесяцігоддзя такіх выдатных майстроў паэтычнага слова, вядомых далёка і за межамі нашай Радзімы, як Максім Рыльскі, Паўло Тычына, Уладзімір Сасюра.

Максім Тадзевіч Рыльскі — які ён усеабдымны. Яго паэтычнае слова не ведала межаў. Амаль кожны куток братняй Украіны знайшоў адлюстраванне ў яго цудоўнай паэзіі, і не толькі кожны куток зямлі, а і кожны куток чалавечай душы. Ён быў рэалістам і рамантыкам і вандроўнікам. Яго няма, але вершы яго ў бясконцым падарожжы, сярод людзей, і ўсё больш і больш чытачоў прыпісваецца да іх настала.

Паўло Рыгоравіч Тычына — яго гранёнае, чаканнае слова глыбока запала мне ў душу. Ёсць радкі ў сусветнай паэзіі, якія ўразаюцца ў сэрца адразу і навечна. «На майдані, біля церкви, революція іде...» Як мала слоў і як многа сказана! Я ўспамінаю Паўла Рыгоравіча—чалавека вялікай культуры, сціплага і ў той жа час патрабавальнага да нашае працы, і, калі я бяруся за яго томік, перада мной усплывае братняя Украіна.

Уладзімір Сасюра — палымяны пясняр рэвалюцыі. Лірыка Сасюры заўсёды маладая, пявучая. І ў той жа час ніхто так, як Сасюра, не апяваў магутны поступ украінскіх шахцёраў і маладых барацьбітоў за Савецкую ўладу. А ягоныя песні дружбы! А славутная «Білорусь, ти моя Білорусь, сіньоока сестра України...»!

Няма ўжо нашых дарагіх сяброў Паўла Тычыны, Максіма Рыльскага, Уладзіміра Сасюры, але ў дні слаўнага пяцідзесяцігоддзя Савецкай Украіны мы адчуваем іх у першых радах братняй украінскай і ўсёй савецкай паэзіі.

Мы, савецкія пісьменнікі, рады, што сёння з намі цудоўная паэзія Міколы Бажана, Андрэя Малышкі, Леаніда Первамайскага, Міколы Нагнібяды, Платона Варанька, Тэрэня Масэнкі, Паўла Усэнкі, Дзмітра Паўлычкі і другіх нашых таварышаў. Кожны з іх своеасаблівы, а разам — які гэта цудоўны хор таленавітых песняроў таленавітага народа.

Мы, беларусы, шчаслівыя, што нашы дарагія ўкраінскія сябры ніколі не забываюць нас. Мы заўсёды радасна сустракаем іх у нас. Даводзіцца і нам часта бываць на гасцінная украінскай зямлі. Вось і сёння, калі я пішу свае словы да слаўнага пяцідзесяцігоддзя Савецкай Украіны, уся ўкраінская зямля, усе мае ўкраінскія сябры ў мяне перад вачыма. Як быццам я іду па Крашчаціку і стаю на Уладзімірскай горцы ў Кіеве, як быццам я на перавале ў Карпатах, паблізу Ужгарада, дзе палілі агні дружбы са слаўнымі закарпатцамі, як быццам я ў шахцёрскім Луганску сачу за тым, як ідуць на-гара бясконцыя тоны чорнага золата, як быццам я на пявучай радзіме Тараса слухаю задушэўныя песні дзяўчат, як быццам я на тым месцы, дзе стаіць з поглядам, накіраваным ў бяссмерце Украіны, вялікі Кабзар...

І яно так. Пяцьдзесят гадоў вольнай Савецкай Украіне. А яна бессмяротная, як і бессмяротны яе слаўны, гераічны, працавіты народ.

А. КАНСТАНЦІНОПАЛЬСКІ, А. ХМЯЛЬНІЦКІ. Абвяшчэнне Савецкай улады на Украіне. Харкаў. 1917 г. (Масла).

УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА

Аляксей ПАЛТАРАЦКІ

Я належу да тых, хто яшчэ памятае жывога гарадавога. Я ўласнымі вачыма бачыў, як Яго Імператарская Вялікасць цар Мікалашка праязджаў у адкрытым фаэтоне па Бібікаўскаму бульвару — якраз там, дзе замест помніка графу Бобрынскаму пастаўлена зараз конная статуя першага савецкага каменданта Кіева Міколы Шчорса, а насупраць узвышаецца дзевяціпавярховы мадэрнавы дом. Тады ўздоўж бульвара Шаўчэнкі раслі таполі. Іх высеклі ў вайну гітлераўскія захопнікі. Але пасля вызвалення Кіева дрэвы былі пасаджаны зноў, і зараз яны не менш высокія, чым пяцьдзесят гадоў назад.

Ідзеш па кіеўскіх вуліцах і ўспамінаеш: на тым балконе стаяў кулямёт, які страляў па дзянікінцах, што адступалі ўверх па Сталыпінскай, зараз вуліцы Чкалава. А вунь след на доме ад артылерыйскага абстрэлу ў 1918 годзе. На месцы, дзе цяпер Міністэрства культуры, мы яшчэ нядаўна разбіралі завал бітай цэглы. Левы бок Крашчаціка вышэй за правы, таму што дамы там стаяць на руінах збудаванняў, знішчаных у час фашысцкай акупацыі. І так крок за крокам...

Усяго паўстагоддзя, а колькі падзей — цэлыя гістарычныя эпохі. Шукаю ў дзіцячых успамінах якое-небудзь новае ўражанне, што ярчэй за іншыя ахарактарызавала б прыход новай рэвалюцыйнай эпохі. Здаецца, знаходжу.

Гэта Крашчацік, ад краю да краю запоўнены людзьмі. Такім ён, напэўна, ніколі раней не быў. Куды падзеліся цяхіх прахожыя на тратуарах, разявакі ля помніка міністру Сталыпіну з высечанай фразай, з якой ён звяртаўся да рэвалюцыянераў: «Вам патрэбны вялікія ўзрушэнні, нам патрэбна вялікая Расія», куды падзеліся «ліхачы» на гумавых шынах і смешныя аўтамабілі «цыкламёты» на трох колах, вусаты гарадавы з чырвоным шнурам на грудзях.

Усё гэта змецена рэвалюцыяй. У дні Кастрычніка на Крашчаціку відаць былі толькі галовы. Галовы сотняў тысяч людзей, абсалютнай большасці кіеўскіх жыхароў, якія не маглі ўсядзець дома. Народ выйшаў на шырокі праспект гісторыі, каб тварыць яе ўласнымі сіламі, уласнымі рукамі.

Зараз двойчы ў год мы бачым дэманстрацыі працоўных у розных гарадах, па тэлевізару сочым за парадамі на Краснай плошчы. Справа звычайная. Тады ж, паўвеку таму назад, відовішчы вулічных дэманстрацый, масавыя мітынгі, там, дзе яшчэ зусім нядаўна дзейнічаў загад: «Больш чым утрох не збірацца!» — былі з'явы нябачанай, сімвалам сапраўднага абуджэння народных мас.

Лічбы нашага росту агульнавядомыя і няма патрэбы нагадваць, у колькі дзесяткаў разоў у Савецкім Саюзе, і ў прыватнасці на Украіне, узраслі вытворчасць металу, вугалю, электраэнергіі, выпуск газет і кніжак, чаму раўняецца прадукцыйнасць працы рабочага на пракатным стане або калгасніка за штурвалам камбайна.

Я прывяду, здавалася б, нязначны факт, звязаны з біяграфіяй аднаго, нічым не прыкметнага чалавека: дворніка дома на вуліцы Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Кіеве. Здарылася гэта параўнальна нядаўна. У першы ж дзень, як дворніка ўзялі на работу, пра яго загаварылі ўсе жыхары вялікага дома. Ён стаў сенсацыяй з сенсацый. А «праславіўся» дворнік вось чым: калі яго паслалі з нейкім спісам па кватэрах, ён, зайшоўшы ў першую, сказаў: «Паглядзіце, дзе ваша прозвішча, і распішыцеся, таму што я непісьменны!»

Здавалася б, каб дворнік заявіў, што ён хворы на чуму або зваліўся з Месяца, — гэта не зрабіла б большага ўражання. Непісьменны?! Кажучы па праўдзе, я і сам не разумеў, як гэта магло здарыцца; відаць, гэта адзін з сумных вынікаў апошняй вайны. Экстраардынарны выпадак быў абмеркаваны на прэзідыуме райвыканкома, яму неадкладна прызначылі настаўніка. Аб існаванні аднаго непісьменнага, наколькі помніцца, было даведзена да ведама Міністэрства асветы, і да яго на радзіму ў вёску паслалі камісію, каб выявіць, як гэта магло здарыцца, што там вырас непісьменны чалавек. Адзін непісьменны — і гэта ў рэспубліцы, дзе паўстагоддзя назад не ўмелі ні чытаць, ні пісаць трое з чатырох.

Чалавечая памяць мае такую асаблівасць, што з яе выветрываюцца амаль усе непрыемныя ўспаміны. «Калі б не гэта, — пісаў акадэмік Паўлаў, — усё чалавецтва даўно б звар'яцела».

Але ёсць успаміны, якія не павінны знікаць. Нельга забываць, у якім прыгнечаным становішчы былі народы краіны да рэвалюцыі, — нельга забываць таму, што без гэтага немагчыма да канца ацаніць і зразумець дыстанцыю, якую прайшла за паўстагоддзе Савецкая краіна пад вялікім і непераможным Ленінскім сцягам, кім мы былі і кім сталі.

Я пішу гэтыя радкі на ўкраінскай мове. А быў час, калі замест роднай мовы на Украіне даводзілася карыстацца, уявіце сабе. ...французскай. Каб не быць галаслоўным, прывяду гістарычны факт: на канцэрце хору пад кіраўніцтвам Кошыца ў былым Купецкім Сходзе (цяпер Калонная зала сталічнай філармоніі) украінскія народныя песні дазвалялася спяваць толькі па-французску, бо ўкраінская мовы, паводле «тлумачэння» цыркуляра царскага міністра Валуева, не было, няма і не можа быць. Толькі адна газета час ад часу выходзіла на ўкраінскай мове, хоць і была веснікам мясцовай буржуазіі: «Рада» («Савет») або «Новая Рада» («Новы савет»). Немагчыма было купіць кніжку на роднай мове, бо адзіная ўкраінская кнігарня ў Кіеве часцей была апячатана паліцэйскім сургучом, чым адкрыта для пакупнікоў. А цяпер на Украіне больш за семсот членаў Саюза пісьменнікаў, якія пішуць творы на роднай мове. Кнігі друкуюцца ў нас мільёнамі экземпляраў. А за мяжой у перакладах выдадзена звыш дзвюх тысяч кніг украінскіх аўтараў. На святкаванне 150-годдзя з дня нараджэння нашага кабзара ў Кіеў прыехалі лепшыя прадстаўнікі сусветнай літаратуры і прывезлі з сабой кнігі Шаўчэнкі, перакладзеныя на ўсе асноўныя мовы свету. Дзесяткі мільёнаў украінцаў слухаюць радыё таксама на роднай мове.

Я ўспамінаю часы пачатку 20-х гадоў. Бурнае развіццё нацыянальнай культуры. Украіна заспявала тысячамі народных хораў, расквітнела выстаўкамі маладых мастакоў — і народнай творчасці. З'явіліся сотні газет, часопісаў. З сёл да цэнтраў — у Харкаў, Кіеў і іншыя гарады пачалі з'язджацца дзесяткі здольных маладых пісьменнікаў. Большасць з іх мела толькі пачатковую адукацыю, некаторыя ўпершыню апынуліся ў вялікім горадзе, але якраз яны былі найбольш таленавітыя.

Да Тычыны, Рыльскага, Семянка і яшчэ аднаго-двух літаратараў старэйшага пакалення далучылася многа новых пісьменнікаў, якія склалі славу першага пакалення маладой украінскай савецкай літаратуры. Гэта Андрэй Галаўко, Мікола Бажан, Гео Шкурупій, Уладзімір Сасюра і многія іншыя.

Вышэй я ўспамінаў аб хоры Кошыца, якому было дазволена спяваць толькі па-французску. А цяпер хочацца расказаць аб нядаўнім наведанні Францыі групай украінскіх дзеячоў культуры. Гэты візіт быў звязаны з Днямі Украіны, якія арганізавала таварыства «Францыя — СССР», паралельна Дні французскай культуры праходзілі ў нас у рэспубліцы.

Я падумаў, што няма ліха без дабра. Магчыма, харысты Кошыца з таго «начальніцкага» загаду атрымалі некаторую карысць, вывучыўшы па сотні французскіх слоў. Мы, іх нашчадкі, разам з нашай роднай мовай вывучаем і французскую мову ў школах і інстытутах і ўжо, напэўна, пераўзышлі ў ведах сваіх пявучых продкаў. Ва ўсякім выпадку многія з нас валодаюць мовай Гюго і Тарэза.

У той паездцы мы расказвалі гасцінным гаспадарам аб мінулай і сённяшняй Украіне. Што мы мелі ў цёмным мінулым і што мы маем цяпер!..

У далёкім мінулым кароль Генрых I ажаніўся з Ганнай Яраславаўнай. І ўжо сам факт, што кароль краіны, дзе так многа прыгажунь, выбраў сабе жонку ўсё-такі ў Кіеве, аб чымнебудзь ды гаворыць.

А што мы маем сёння?

Тут пачалася размова аб тым, што Украінская рэспубліка па тэрыторыі такая ж, як Францыя, што ва ўмовах сацыялістычнага грамадства мы ганарымся не толькі прыгажосцю сваіх дзяўчат. Ну, да прыкладу, шахты толькі адной вобласці Данбаса — Луганскай, даюць вугалю больш, чым усе шахты Францыі. Што ў нас больш, чым у іх краіне, выпускаецца чыгуну, сталі, чорных металаў, пракату; што па вытворчасці цукру з буракоў мы займаем першае месца ў свеце; што ў нас адна масавая бібліятэка на тысячу чалавек насельніцтва, у семдзесят разоў больш, чым у ЗША.

Мы гаварылі аб тым, як высока ўзнялася наша культура. Мы ведаем, што французскія мысліцелі далі заснавальніку навуковага камунізма Карлу Марксу адну з асноўных крыніц для тэорыі марксізма. Мы ведаем вялікіх пісьменнікаў Францыі і з гордасцю можам сказаць, што выданні ва ўкраінскім перакладзе кніг Віктара Гюго і Жюля Верна перавысілі нават колькасць французскіх. Нашых гасцей прывяло ў захапленне паведамленне, што ў нашай дэлегацыі ёсць нават навуковы супрацоўнік жанчына, якая абараніла, кажучы мовай французаў, магістарскую дысертацыю на матэрыяле творчасці Ражэ Мартэна дзю Гара, славутага пісьменніка іх зямлі.

Мы пражылі пяцьдзесят гадоў, з якіх менш за палавіну змаглі аддаць мірнаму будаўніцтву, а астатнія вымушаны былі ваяваць і пераадольваць пасляваенныя разрухі. Якая яшчэ краіна, акрамя нашай, сацыялістычнай, змагла б так хутка нанова пабудаваць гіганцкія заводы, электрастанцыі, узвесці новыя гарады, дасягнуць такіх яркіх жыватворных змен. І сёння, калі, як і ўчора, мы святкуем пяцідзесяцігоддзе Кастрычніка і пяцідзесяцігоддзе роднай Савецкай Украіны ў росквіце працоўных будняў, мы гатовыя да працы і абароны.

НЯСІ, ДНЯПРО, ВІНШАВАННІ!..

Валянцін ЦІХАНОВІЧ

Горда ля Канева ўзвышаюцца кручы над сівым і вечна юным Дняпром. З высачэзнага кургана на тых кручах глядзіць на шчаслівую сённяшнюю Украіну бронзавы Кабзар.

Здзейсніліся прарочыя словы вялікага Тараса: у сям'і вольнай, новай і вялікай, вольная і вялікая, квітнее Украіна. На ўвесь свет вядомы яе поспехі, яе чароўныя песні, яе яркае мастацтва.

Здаўна зразумелае і блізкае украінскае мастацтва беларусу. Нашы паэты, мастакі, кампазітары, архітэктары, артысты добра ведаюць, шануюць і прапагандуюць мастацкія скарбы Украіны.

Ад гісторыі ўсяго савецкага мастацтва неадрыўная натхнёная творчасць выдатнага баталіста М. Самокіша, мастакоў К. Трахіменкі, Г. Святліцкага, В. Касіяна, цудоўны жывапіс Т. Яблонскай, А. Шаўкуненкі, М. Бажыя, І. Бакшая. З задавальненнем глядзім мы іх творы на ўсесаюзных выстаўках, у Кіеве і ў нас у Мінску.

Мне вельмі падабаецца эдольнасць маіх калег-украінцаў у кожным сваім творы захоўваць нацыянальны характар. Працу ўкраінскага графіка не зблытаеш з лістом мастака іншай рэспублікі.

Яшчэ са сваіх студэнцкіх год я добра знаёмы з працамі славутых украінскіх графікаў Касіяна і Дэрэгуса. Вельмі падабаюцца мне бліскучыя па гумары і па майстэрству лінагравюры майго цёзкі В. Літвіненкі. Тое ж магу сказаць пра ксілаграфіі кіеўскага мастака Казлоўскага.

На працягу доўгіх гадоў, працуючы над карыкатурамі для часопіса «Вожык», я добра ўведаў па малюнках у «Перцу» многіх майстроў-карыкатурыстаў братняй Украіны. Аднойчы нават, знаходзячыся ў Кіеве, пайшоў пазнаёміцца да «перачан». І з таго часу многія з украінскіх мастакоў-сатырыкаў сталі маімі сябрамі...

Хутка, імкліва бяжыць наш Дняпро на поўдзень, міма помніка Кабзару, да самага Кіева і далей праз усю Украіну. Дык вазьмі ж ты, бацька Дняпро, нашыя віншаванні і нясі іх у гэтыя ўрачыстыя дні на Украіну, проста да нашых сяброў і братоў!..

Бажаемо Вам, друзі, великого щастя та добрых успіхів!..

ДАРАГІЯ НАШЫ СУСЕДЗІ

Анатоль АСТРЭЙКА

Споўнілася паўвеку, як над сонечнай Украінай горда палымнее сцяг неўміручага Кастрычніка. Свята Украіны—свята Беларусі. У гэтую знамянальную дату нельга не прыгадаць, што наша братэрства было шчырым і сапраўдным на працягу ўсіх стагоддзяў. І сёння, у дзень светлага ўкраінскага свята, хочацца гаварыць вершамі:

Моцны дружбай наш савецкі дом,
Я сябрамі шчыра ганаруся.
Украіны песні мы пяём,
Украіна—песні Беларусі.
Справы—нашы будуць жыць вякі.
Кіеў—Мінск! Іх дружба неўміручa.
І Шаўчэнкі і Купалы землякі.
Як браты і сёстры, неразлучны

Наша братэрства, наша дружба мацаваліся і набывалі трывалую аснову з незапамятных дзён, з далёкай сівой мінуўшчыны, ажно з часоў Кіеўскай Русі. Мы, суседзі і браты родныя, пранеслі гэтую дружбу праз вякі чыстай і незаплямленай.

У нашых народаў ёсць добрая прымаўка, якая як нельга лепш характарызуе ўзаемаадносіны брата з братам: «Калі ты шукаеш дружбы ў брата, то ён табе не брат». Дружба беларусаў і ўкраінцаў заўсёды жыла і жыве, яна не магла быць інакшай, чым братняй.

Сёння нельга не ўспомніць пра тое, што Украіна і Беларусь, разам з Расіяй, пад аднымі сцягамі білі сваіх ворагаў: польскіх шляхцюкоў, нямецкіх псоў-рыцараў, татарскіх ды персідскіх грабежнікаў. І да гэтага часу жыве ў нашых народаў славутая прымаўка: «Загінуў, як швед пад Палтавай». Яна стасавалася і стасуецца да ўсіх захопнікаў, якія праглі нашага дабра і крыві.

Украінскія кабзары ды беларускія лірнікі і дудары натхнялі сваё воінства, услаўлялі подзвігі народных ратаборцаў.

Во аднолькавае гора
У нас некалі было,
І адзін і той жа вораг,
І адно і тое ж зло.
І Гаркуша і Небаба—
Беларускія сыны—
Білі ворагаў з Хмяльніцкім
На Дняпры і ля Дзясны.
Не бывала ў нас разладу,
Сведкай гэтаму вякі.
Нашу зброю, нашы ўдары
Добра помняць чужакі...

У цяжкія хвіліны знайшоў сабе гасцінны прытулак у сваіх братоў выдатны наш паэт Францішак Багушэвіч, які хаваўся ад царскіх сатрапаў на Украіне. На некаторы час знайшла сабе прытулак на Украіне і Цётка—наша выдатная паэтэса-рэвалюцыянерка. А ў нас бывала цудоўная паэтэса Леся Украінка. На Беларусі напісала яна неўміручую «Лясную песню»...

Ішлі гады. Прыйшоў Кастрычнік. Выраслі нашы дзяржавы, іх людзі. Вырасла і ўзмацнела наша дружба братэрская пад ленінскім сонцам Вялікага Кастрычніка. Паплылі па Дняпры караваны плытоў з беларускім лесам на шахты і ў гарады Савецкай Украіны, а з Украіны ў Беларусь—залатая пшаніца і вугаль. І зажылі нашы людзі новым жыццём і новымі песнямі. І сталі жаданымі гасцямі беларусы ў Кіеве, украінцы—у Мінску. І гэтыя сардэчныя сустрэчы яшчэ больш знітавалі, сцэментавалі нашу дружбу, нашу культуру і літаратуру.

Не забыць і дзён Вялікай Айчыннай вайны, калі народы Савецкага Саюза вялі суровую барацьбу супраць фашысцкіх акупантаў. Мне, былому партызану, хочацца нагадаць эпізоды партызанскай барацьбы беларускага і ўкраінскага народаў. У партызанскіх арміях Каўпака і Сабурава, Навумава і Збанацкага ваявалі тысячы беларускіх сыноў і дачок, а на тэрыторыі Беларусі ў партызанскіх атрадах і брыгадах мужна змагаліся слаўныя сыны ўкраінскага народа. Беларускі народ па праву ганарыцца такімі арганізатарамі і важакамі партызанскага руху, украінцамі па нацыянальнасці, як генерал Піліп Капуста, камбрыгамі і камандзірамі атрадаў Васілём Яроменкам, Іванам Радчанкам, Іванам Ананчанкам... Па заданню пісьменніка Юрыя Збанацкага, камандуючага Чарнігаўскім партызанскім злучэннем, беларускі паэт Рыгор Няхай, вырваўшыся з фашысцкага акружэння, арганізаваў у Каневе падпольную групу з мясцовага насельніцтва для аховы помніка выдатнаму песняру ўкраінскага народа Тарасу Шаўчэнку. Гэтая група потым перарасла ў баявы атрад, які наносіў ворагу адчувальныя ўдары...

Сёння хораша гучыць на беларускай мове «Кабзар» Тараса Шаўчэнкі. Яго пераклалі лепшыя нашы паэты на чале з Янкам Купалам і Якубам Коласам. Здабыткам нашых чытачоў на роднай мове сталі цудоўныя вершы Лесі Украінкі і нашага даўняга і незабыўнага друга Максіма Рыльскага, які прысвяціў Беларусі дзесяткі чароўных вершаў. Выйшлі асобнымі выданнямі на беларускай мове вершы такіх слаўных майстроў мастацкага слова як Паўло Тычына, Уладзімір Сасюра, Андрэй Малышка, Платон Варанько, Мікола Нагнібяда, Іван Няхода, Тарэнь Масэнка, Алэксэй Юшчанка. У перыядычным друку часта гучаць галасы Л. Забашты, Р. Братуня, І. Вырган, Д. Паўлычкі і многіх іншых украінскіх пісьменнікаў.

Беларусь любіць і паважае сваю старэйшую сястру—Украіну, радуецца яе творчым і гаспадарчым поспехам, ганарыцца яе літаратурай і мастацтвам. І больш за ўсё мы цэнім залатыя рукі нашых украінскіх сясцёр і братоў, іх працоўную доблесць, іх шчырыя і адкрытыя сэрцы.

На Савецкай Украіне вялікае свята. Разам са сваімі братамі адзначаем мы светлую дату

Паўстагоддзя прамінула,
Кіеў песнямі грыміць,
Дзе на плошчы на шырокай
Помнік Леніну стаіць.

Шлём прывет, паклон ад сэрца,
Поўны светлае любві,
Дарагім суседзям, родным
І па мове і крыві.

НА ШЧЫРЫ ГОЛАС СЭРЦА АДГУКНЕЦЦА

Уладзімір СТЭЛЬМАХ

Украіна... Без песні, без агняводга танца, без мудрага і пявучага слова яна і не ўмее жыць. Я перабіраю ў памяці адны толькі імёны яе пісьменнікаў, што служылі тэатру, — і перада мною цудоўны летапіс народнага жыцця і змагання. Я ўспамінаю самыя яркія ўражанні ад сцэнічных твораў — і перада мною праходзіць галерэя незабыўных вобразаў Амвросія Бучмы і Наталлі Ужвій, Івана Патаржынскага і Вольгі Літвінечкі-Вольгемут, Гната Юры і Васіля Васілька...

Тэатральнае мастацтва Савецкай Украіны нібы ўзнімае нас на новыя вяршыні і вучыць глыбей разумець чалавечае харастно, высокае прызначэнне асобы. Хваляванне і радасць адчуваем мы, беларусы, калі сустракаем на нашай зямлі лепшыя калектывы майстроў сцэны з Кіева і Мікалаева, Львова і Харкава, Чарнігава і Данецка.

Гісторыя тэатра на Беларусі нібы яскравымі вяхамі адзначана пастаноўкамі п'ес украінскіх драматургаў. Стваральнік «Першай беларускай трупы», наш выдатны тэатральны дзеяч Ігнат Буйніцкі паклаў пачатак добрай традыцыі, якая захоўваецца ўвесь час: амаль кожны сезон на беларускай сцэне ідуць спектаклі па творах І. Катлярэўскага, М. Крапіўніцкага, І. Карпенкі-Карага, Г. Квіткі-Аснаўяненкі, У. Самаргі, І. Мікітэнкі, А. Карнейчука, В. Мінко, Е. Яноўскага, М. Заруднага.

Нельга забыць шчодрага на пачуцці і мудрага ў сваіх учынках Бераста з «Платона Крэчата», вобраз якога стварыў Уладзімір Крыловіч, Л. Рэжцкую (Ліду) і І. Ждановіч (Майку), Г. Грыгоніса (Бублік) у змястоўнай рэжысуры Міхаіса Зорава на падмостках Першага БДТ у 1935 годзе. Тады ж значнай падзеяй у творчым жыцці Другога БДТ у Віцебску стала прэм'ера «Гібелі эскадры», якую паставіў славуты майстар К. Зубаў з А. Ільінскім, М. Звездачотавым, Р. Кашэльнікавай і П. Іванавым у галоўных ролях.

Увогуле Аляксандр Карняйчук — адзін з самых папулярных драматургаў у нас: на беларускай сцэне ставілі амаль усе яго драмы і камедыі. У час вайны, да 25-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, Першы і Другі БДТ (цяпер тэатры імя Купалы ў Мінску і Коласа — у Віцебску) паставілі наватарскую п'есу «Фронт», ролі ў якой выконвалі лепшыя майстры сцэны— Ул. Уладамірскі, Б. Платонаў, Л. Рахланка, Ц. Сяргейчык.

Зусім нядаўна коласаўцы паказалі ў першы раз новы спектакль — драму «Зберажы маю тайну» Вадзіма Сабко.

Цікава, што дэбютам «беларускага салаўя» Ларысы Александроўскай на сцэне было выступленне ў прадстаўленнях украінскай трупы ў Мінску — «Сватанне на вечарніцы», «Запарожац за Дунаем». А ў 1952 годзе з надзвычай тонкім адчуваннем украінскага музычнага стылю, характараў і эпохі цудоўнага твора кампазітара С. Гулак-Артэмоўскага яна ставіць гэтую оперу на сцэне тэатра оперы і балета.

Мабыць, і цяпер, калі Савецкая Украіна святкуе свой слаўны юбілей, нашы гледачы ўспамінаюць тыя гадзіны, што праводзілі яны ў тэатры разам з дзяцёлымі і мужнымі героямі, перажывалі тое пачуццё мастацкай асалоды, якое заўсёды прыносіць нам мастацтва сяброў і суседзяў.

Паміж беларускімі пісьменнікамі і іх украінскімі калегамі — даўняя і цесная дружба. Дружба гэтая асабліва ўмацавалася пасля Вялікага Кастрычніка. Літаратары Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны шчыра радуюцца поспехам адзін аднаго, перакладаюць адзін аднаго, часта бываюць у гасцях адзін у аднаго.
На ўспамін пра адну з такіх сяброўскіх сустрэч — сустрэчу ўкраінскага паэта Тэрэня Масэнкі, беларускіх пісьменнікаў Кандрата Крапівы і Ілы Гурскага — зрабіў гэты здымак наш фотакарэспандэнт Ул. Крук.

Андрэй МАЛЫШКА

ПОЎДЗЕНЬ ВЕКУ

Поўдзень веку дваццатага, смела ідзі
І пастукайся свету ў незамкнёную хату
Не пажарам злавесным, не крыкам жуды
І не новага бою страшэнным раскатам.

Сонца свеціць ярчэй — у сярэдзіне дня,
Даспяваюць сады—у сярэдзіне лета.
Для мяне ты таварыш, і брат, і радня,
Век дваццаты, людскою недзеяй сагрэты.

Ад цябе я нічога ў жыцці не ўтаю:
Хлеб і соль, і цяжкую гаркоту сваю,
Падзялю кроплю шчасця, дыханне любові,
Клёкат сэрца майго неспакойнага ў слове
Улію ў стогадовую долю тваю.

Толькі кроч між людзей і выходзь на работу,
Не сціраючы з твару салёнага поту.
Век пражыць—не па ніве прайсці гаманлівай,
Ну а ты ўжо прайдзі з намі гэтаю нівай!

Пераклаў Генадзь БУРАЎКІН.

СВЯТА МАСТАЦТВА РЭВАЛЮЦЫІ

Над Цэнтральнай выставачнай залай Масквы — флагі ўсіх саюзных рэспублік. Унутры — святочна і ўрачыста. Некалькі тысяч чалавек штодзень наведваюць Усесаюзную юбілейную мастацкую выстаўку, на якой прадстаўлены дзве тысячы палотнаў, скульптур, графічных лістоў.

Больш за тысячу аўтараў, якія ўдзельнічаюць у выстаўцы,— гэта майстры ўсіх пакаленняў. Ад старэйшыны савецкага выяўленчага мастацтва Сяргея Канёнкава — праслаўленага 93-гадовага скульптара да толькі пачынаючых свой шлях у мастацтве маладых мастакоў, якія нарадзіліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Паняцце «савецкае мастацтва» нарадзілася ў гарніле рэвалюцыйных баёў. Яно прынесла свету новы этап у мастацкім развіцці чалавецтва, захаваўшы гістарычную пераемнасць лепшых традыцый нацыянальнага і сусветнага мастацтва, развіваючы іх у новых умовах, сцвярджаючы новы тып сацыялістычнага героя. Гэты новы герой — чалавек, узняты рэвалюцыяй, стаў актыўнай дзеючай сілай на фронце барацьбы, працы і стварэння.

Вобраз чалавека новага свету — яго сацыяльны аптымізм, яго неўтаймавальная воля, мужнасць, гераізм, яго чалавечая прывабнасць увасобіліся ў лепшых творах савецкага мастацтва.

Карэспандэнты Агенцтва друку Навіны Г. Анісімаў і А. Байгушаў папрасілі некалькіх удзельнікаў Усесаюзнай юбілейнай мастацкай выстаўкі падзяліцца сваімі ўражаннямі.

Сяргей КАНЁНКАЎ,

народны мастак СССР

Лепшыя традыцыі савецкага мастацтва звязаны з імем Сяргея Канёнкава. Старэйшына мастакоў працуе па сённяшні дзень, творачы сам і дапамагаючы многім маладым знайсці сваю сапраўдную дарогу ў мастацтва.

Я ўдзельнічаю ў юбілейнай выстаўцы скульптурнай кампазіцыяй «Мікалай Астроўскі». Тэма высокай і высакароднай чалавечай годнасці, мужнасці, духаборства стала мне дарагой яшчэ перад Кастрычніцкай рэвалюцыяй, калі я працаваў над скульптурай «Самсон, які разрывае ланцугі». Мікалай Астроўскі — з гэтага племя людзей. Ён страціў зрок, але застаўся ў страі, яго сэрца перапоўнена энергіяй дабра і праўды.

Мне пашчасціла прымаць удзел у ажыццяўленні ленінскага плана манументальнай прапаганды ў самым яго пачатку. Гэта быў трывожны для краіны час — інтэрвенцыя, грамадзянская вайна, голад, разруха. Але маладая Савецкая дзяржава імкнулася развіваць культуру. Адкрываліся штодзённа дзесяткі выставак, помнікаў, мемарыяльных дошак, барэльефаў. Помнікі гэтыя былі простыя, даступныя для ўсіх. У іх жыў дух рэвалюцыйнай рамантыкі. У іх не было натуралістычнай вяласці і фальшывай пампезнасці, не было таго, што прыводзіць мастацтва да бяздушнага рамяства.

Сучаснае мастацтва заклікана абуджаць у чалавеку творца, выхоўваць у ім добрыя, светлыя пачуцці, весці наперад.

Я адчуваю вялікае шчасце мастака, што ў мае 93 гады я, зноў прымаючы ўдзел у ажыццяўленні ленінскага плана манументальнай прапаганды, працую над новым варыянтам мемарыяльнай дошкі для Крамлёўскай сцяны.

Аляксей СЦЯПАНАЎ,

член праўлення Саюза мастакоў Казахстана

З той хвіліны, як Аляксей Сцяпанаў убачыў запуск касмічнай ракеты, ён зразумеў, што цяпер гэтая тэма назаўсёды паселіцца ў яго майстэрні. Ужо вядомы яго карціны — «На касмадроме», «Ля Байканура», «Да другіх планет», а ў планах — новыя і новыя работы.

Мастакі майго пакалення нарадзіліся ўжо пры Савецкай уладзе. Для нас не было нічога непрывычнага, асаблівага, выключнага ў тым, што мы, закончыўшы школу, самі выбіралі свой шлях у жыццё. Толькі вайна парушыла планы, і многія з нас проста з мастацкага вучылішча пайшлі на фронт. Я хачу сёння ўспомніць маіх таварышаў-мастакоў, якія загінулі за нашу справядлівую справу. Не цяжка сабе ўявіць, якая радасць свяцілася б у іх вачах, калі б яны ўдзельнічалі ва Усесаюзнай юбілейнай мастацкай выстаўцы, прысвечанай 50-годдзю Кастрычніка.

Я жыву і працую ў Алма-Аце — выдатным горадзе, з якім звязана многае ў маёй творчасці. Тут я напісаў свае лепшыя карціны, тут рэалізаваў задумы, якія доўга не давалі мне спакою.

Аднойчы я вяртаўся з палявання. Ехалі стэпам. З начной цішынёй пад белым агнём фараў раскрываліся далі і тут жа зноў знікалі ў цемры. І раптам адбылося нешта неверагоднае: увесь стэп раптам асвяціўся прывідным бела-перламутравым святлом, якое нібы разразала ўсё вакол. Святло мігацела, рухалася, пагойдвалася, і наваколле дзіўна мяняла свае абрысы. Мы доўга не разумелі, што б гэта магло быць, пакуль хтосьці не ўсклікнуў: «Ракета пайшла!»

Гэты першы касмічны запуск, ажыццёўлены з казахстанскай зямлі, глыбока ўсхваляваў мяне. Касмічныя рэйсы ўвайшлі ў рытм нашага жыцця, сталі яе неад'емнай часткай. Байканур — так называлася кропка Зямлі, якая ўвайшла ў гісторыю. Яна была побач, адгароджаная ад Алма-Аты задумлівым жоўтым стэпам. «Як жа мы, жывучы побач, пройдзем міма гэтай жыватворнай тэмы, народжанай самім нашым жыццём»,— падумаў я. Па першаму ўражанню пачаў я працаваць над карцінай «Да другіх планет». Яна далася мне цяжкай працай: некалькі разоў я пачынаў нанава, перарабляў, мяняў кампазіцыю і колер. Мне хацелася дабіцца прастаты і манументальнасці. У той жа час я разумеў, што звычайнымі выяўленчымі сродкамі касмічную тэму вырашыць немагчыма. Трэба адкінуць літаратуршчыну, адысці ад ілюстрацыйнасці і прывычных рашэнняў.

Я выкарыстаў у карціне толькі тры колеры — белы, фіялетавы і ружаваты.

Касмічная тэма захапіла мяне. Я пісаў пейзажы, нацюрморты, кампазіцыі, звязаныя з зямнымі сюжэтамі, але ўвесь час дзесьці ў свядомасці вынашваліся задумы новых карцін, прысвечаных космасу.

Наведваючы выстаўкі, я заўсёды радаваўся, калі мастакі звярталіся да гэтай бясконца цікавай тэмы. З усяго, што я бачыў, найбольш значным здалося мне вялікае палатно «Касманаўт», створанае братамі Аляксандрам і Пятром Смолінымі.

«На касмадроме», «Касмічны нацюрморт», «Байканур», «Да зорак» — вось назвы самых дарагіх мне работ. Не ведаю, ці ўдалося мне выказаць усё, што мяне вабіла і хвалявала, але працаваў я з вялікім напружаннем, з радасцю.

Міхаіл ГРЭКУ,

намеснік старшыні праўлення Саюза мастакоў Малдавіі

Бясспрэчна, адным з найбольш цікавых аўтараў на Усесаюзнай выстаўцы з'яўляецца малдаўскі жывапісец Міхаіл Грэку, які прадставіў трыпціх «Гісторыя аднаго жыцця». Гэта гісторыя жыцця малдаўскага працаўніка, земляроба, гісторыя паэтычная, драматычная, светлая. Мастак любіць свайго героя, выказваючы гэтую любоў проста і таленавіта.

Больш за ўсё ў сучасным савецкім жывапісу я цаню сардэчнасць. У нейкай меры яна традыцыйная: хіба не былі сардэчнымі творы народнага мастацтва? Што ж, мы вельмі цэнім гэту нашу традыцыю! Народныя майстры заўсёды будуць прыкладам самага высокага мастацтва на многа вякоў наперад.

Калісьці Анры Маціс гаварыў, што яго пакаленне б'ецца над тым, каб асвяжыць сродкі выяўлення, каб маляваць і пісаць не па завучанаму шаблону, а адлюстроўваць так, як дыктуе прадмет, вобраз. Мне здаецца, што гэты прынцып з'яўляецца асновай сардэчнасці ў мастацтве. Пасля асвяжэння сродкаў жывапісу мастакі зноў звернуцца да карцін на гістарычныя тэмы, дадаваў Маціс. Правільнасць яго думкі пацвярджаецца нашай практыкай. Сучасны жывапіс — гэта не механічная сума прыёмаў. Сёння жывапісцы, дзякуючы вельмі багатай традыцыі, выпрацаванай усім ходам развіцця мастацтва, імкнуцца ісці не ў шырыню, а ў глыбіню. Ад халоднасці, сухасці, знешняй эфектыўнасці — да паэзіі, усхваляванасці, дабраты, псіхалагічнай сілы. Адным словам, да таго, што ёсць у народнай творчасці.

Маё пакаленне мастакоў Малдавіі вырасла ў вёсцы, у непасрэднай сувязі з народным мастацтвам. З маленства выхавана ў нас шчырая павага да гэтага мастацтва. З самымі чыстымі пачуццямі звярталіся мы да яго з маленства. А што гаварыць цяпер, калі мы самі працуем у мастацтве! Вядома, для нас гэта стала крыніцай натхнення, прыкладам шчырасці і духоўнасці. У маім трыпціху «Гісторыя аднаго жыцця» я паспрабаваў арганічна спалучыць сродкі сучаснай выяўленчасці з народнай традыцыяй. Я бачу гэта імкненне ў многіх карцінах, паказаных на ўсесаюзнай выстаўцы. Гэта радасна, таму што тэндэнцыя такога спалучэння развіваецца шырокім фронтам.

Таццяна ЯБЛОНСКАЯ,

народны мастак Украіны.

Таццяна Яблонская атрымала вядомасць даўно. Яе творчая манера была агульнапрызнана. Але вечны пошук нястрымна вабіць яе. І вось на юбілейнай выстаўцы яна выступіла ў новай манеры, лаканічнай, вельмі нечаканай па каляровай настройцы.

Юбілей краіны асабіста для мяне — таксама юбілей, мне споўнілася столькі ж, колькі Кастрычніку. Я ўдзельнічаю ва Усесаюзнай выстаўцы новай работай. Ад усёй душы хочацца мне парадавацца за мастакоў з розных гарадоў краіны, з розных рэспублік, прадстаўнікоў усіх нашых нацыянальных школ, якія выступілі з новымі творамі, прысвечанымі гераічнай гісторыі, стваральнай сучаснасці, светлай будучыні.

У аснове кожнага твора павінна быць дзейсная вобразная ідэя. Яна заўсёды намнога складанейшая і патаемнейшая за знешні сюжэт адлюстравання. Для выяўлення вобразнай ідэі неабходна шукаць сродкі выразнасці праўдзівыя, глыбінныя, новыя. Па гэтым шляху ідзе многанацыянальнае наша мастацтва.

Радасна бачыць цяпер яркае развіццё талентаў у нацыянальных рэспубліках, на былых ускраінах царскай Расіі. Усё лепшае ў нашым мастацтве вырасла на развіцці і асваенні народных традыцый. Гэтыя традыцыі — стымул пошукаў новага, аснова глыбокага пранікнення ў сутнасць нацыянальнага характару.

Мяне вельмі хвалюе паэзія народнага жыцця, прастата людскіх узаемаадносін. І ўсё гэта так поўна выказана ў песнях і нашым народным мастацтве. У ім — заўсёды вялікая прыгажосць, высакароднасць, сцвярджэнне светлых пачаткаў жыцця.

У маіх апошніх работах я таксама імкнулася як бы спець песню аб цудоўным краі, дзе я жыву, аб выдатных людзях-працаўніках, аб іх часам цяжкіх, але поўных вялікай чалавечай годнасці лёсах.

У мяне адно жаданне, каб яшчэ больш ярка расквітнелі таленты ў шматнацыянальным сузор'і нашага мастацтва.

Тагрул НАРЫМАНБЕКАЎ,

народны мастак Азербайджана

Яго карціна «На Эйлагу» — адна з лепшых на выстаўцы. Яркія, жывыя фарбы, напружаная каляровая кампазіцыя раскрываюць перад намі добры свет чалавека. Гэты свет мастак малюе знешне камерна, але паэзія чалавечага сэрца, выказаная сакавіта і шырока, набывае рысы манументальнасці і значнасці.

Калі ідзеш па залах Цэнтральнай выставачнай залы, дзе на юбілейну агляд прадстаўлены работы мастакоў усіх пятнаццаці рэспублік, дык пачуццё радасці нараджаецца перш за ўсё ад непадобнасці, разнастайнасці, здзіўляючай арганічнасці развіцця нацыянальных традыцый.

Таццяна Яблонская гаварыла аб прастаце і наіўнасці, якіх ніякай стылізатарскай падробкай не дабіешся. Мяне зараз таксама вельмі хвалюе праблема спалучэння сучаснай формы з народнымі традыцыямі ўспрыняцця.

У нас у Азербайджане, непадалёк ад Баку, ёсць наскальныя малюнкі, якія адносяцца да 10—12 тысячагоддзя. Дык вось, у гэтых наскальных малюнках жыве столькі навізны, свежасці, прастаты, паэзіі, сучаснасці, што іх можна экспанаваць у лепшых музеях свету як высокі ўзор мастацтва. Я перакананы, што поспех сучаснага мастака тым вышэйшы, чым больш сур'ёзна ён асэнсаваў народныя традыцыі. Да іх можна падыходзіць паблажліва, але на аснове гэтага можна пастаянна ўзнімацца! Я заўсёды захапляюся сілай і страсцю народнага генія.

МАЙСТРЫ З ЖАРАБКОВІЧАЎ

З аўтобуснага прыпынку я ішоў вуліцай вёскі Жарабковічы да белакаменнай з арнаментаваным фасадам школы. І пакуль ішоў, налічыў каля дваццаці дамоў, у якіх то ліштва, то франтоны і карнізы, то ўсё разам ды яшчэ вуглы і ганкі аздоблены тонкай, нібы карунка, драўлянай разьбой. І ніводзін узор не паўтараўся, кожны быў адметны, своеасаблівы, складаны. Іх можна было падоўгу разглядаць, як сапраўдныя творы мастацтва.

У школу я ішоў на сустрэчу з разбяром Лукой Лукічом Войтулем, настаўнікам працы. Знайшоў я яго ў школьнай майстэрні. Лука Лукіч запрасіў мяне ў свой пакой, дзе быў і яго куток са столікам і некаторымі работамі. Ён паказвае мне барэльефы Л. М. Талстога, Ф. З. Дзяржынскага, «Абаронцы Брэсцкай крэпасці», «Барацьба чалавека з арлом», «Алень».

Разьба — не адзінае захапленне Лукі Лукіча. Ёсць у яго таксама шкатулкі, інкруставаныя саломкай, шмат пейзажаў, якія ён любіць пісаць у ваколіцах роднай вёскі. А яшчэ Л. Войтуль — адмысловы таксадэрміст. Ніхто лепш за яго не зробіць чучала птушкі ці звера. Захапляецца сам, умее захапіць і вучыў.

— Над чым вы працуеце як разбяр? — цікавлюся я.

— Шмат задуман. Да 50-годдзя нашай рэспублікі хочацца зрабіць серыю скульптур з дрэва на тэму партызанскай барацьбы беларускага народа. Пакуль што распрацоўваю кампазіцыі ў малюнку, потым буду рабіць у гліне.

— Лука Лукіч, яшчэ адно пытанне. Ці маеце вы дачыненне да драўлянай разьбы, якой ўпрыгожаны дамы?

— Не. Але зараз я пазнаёмлю вас з чалавекам... — і Л. Войтуль запрашае ў пакой старога з сівой барадой-кліночкам. — Аляксей Іванавіч Юркевіч, школьны сталяр...

Стары расказвае пра народнага дойліда і разбяра Марціна Кляйнберга, яго настаўніка. Гэта іх рукамі «выткачаны» ўсе тыя карункі на хатах, якімі я любаваўся, ідучы вуліцай.

— А ў Падлессі ў царкве не былі? — пытаецца ў мяне Аляксей Іванавіч. — Там мы з Марцінам Аўгуставічам некалі такога навырэзвалі, што з усёй ваколіцы людзі сыходзіліся не папоў слухаць, а нашу разьбу глядзець.

Аляксей Іванавіч за свой век зрабіў і нямала балалаек, скрыпак, віяланчэлей, а «на адным кантрабасе і цяпер у аркестры ў раённым Доме культуры іграюць».

— Эх, дайце мне толькі падабраць добрага дрэва! — уздыхае Аляксей Іванавіч. — Я яшчэ такую скрыпку зраблю...

Ішоў я ад сваіх новых знаёмых з радасцю ў сэрцы. Колькі сапраўдных майстроў жыве ў нашых вёсках!..

П. АНДРЭЕЎ.

Ляхавіцкі раён.
калгас «Беларусь».

На здымку — Л. Войтуль за работай.

Фота Ул. ГУРЫНОВІЧА.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

22 снежня

Першая праграма. 11.00 — школьная фільматэка. «Васа Жалязнова». Мастацкі фільм. 16.00 — праграма перадач. 16.05 — «Падзеі дня». Выпуск навін. 16.10 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Англійская мова. Урок 11-ы. 16.30 — для школьнікаў. «Школьныя будні». Пра школу-інтэрнат № 7. 17.00 — «Сёння і заўтра сельскагаспадарчай тэхнікі». Перадача першая. 17.30 — «Сталёвы паток». «100-мільённы рубеж» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.15 — да Дня энергетыка. «Тваімі рукамі, народ» (М). 18.45 — да Дня энергетыка. «На агеньчыку». Перадача з г. Куйбышава. 20.00 — «Эстафета навін» (М). 21.00 — «Аптымістычная трагедыя». Шырокаэкранны мастацкі фільм.

Другая праграма. 20.00 — «Дом, у якім мы жывём». Спектакль Барысаўскага самадзейнага тэатра мініяцюр. 21.00 — фестываль музычных тэатраў краіны. Дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета Літоўскай ССР. Перадача з Вільнюса.

23 снежня

Першая праграма. Для студэнтаў ВНУ. 8.00 — «Начартальная геаметрыя». 8.30 — «Вышэйшая матэматыка». I курс. 9.00 — «Тэхналогія металаў». 9.30 — «Вышэйшая матэматыка». II курс. 13.40 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Англійская мова. Урок 11-ы. 14.00 — праграма каляровага тэлебачання (М). 15.30 — для школьнікаў. «Красін». Старонкі жыцця. Прам'ера тэлевізійнага спектакля (М). 16.30 — тэлевізійныя навіны. 17.00 — «Клуб ніпадарожнікаў» (М). 19.00 — канцэрт, прысвечаны святкаванню 50-годдзя ўстанаўлення Савецкай улады на Украіне. Перадача з Кіева. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Пагранічная цішыня». Тэлевізійны фільм. Першая і другая серыі (М).

Другая праграма. 14.00 — конкурс сучаснага бальнага танца. Трэці тур. 18.00 — дзіцячы экран. «Сланяня». «Непаседа Мяніш і Нятак». Мультыплікацыйныя фільмы. «Як я быў самастойны». Кароткаметражны фільм. 18.55 — «Прадстаўляем — знаёмцеся». Канцэрт студэнтаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. 19.30 — да 50-годдзя з дня ўстанаўлення Савецкай улады на Украіне. «Шчорс». Мастацкі фільм.

24 снежня

Першая праграма. 11.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Сонечны карагод». 11.30 — для школьнікаў. «Аперацыя «Сірыус-2». Навукова-пазнавальная перадача. Трансляцыя з Ленінграда. 12.10 — па залах Дзяржаўнага музея выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна (М). 12.40 — усесаюзны заплыў «маржоў». Трансляцыя з Камсамольскага возера г. Мінска. 13.00 — «Музычная шкатулка». 13.20 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Баявая сяброўнасць» (М). 14.00 — праграма каляровага тэлебачання (М). 15.30 — тэлевізійныя навіны (М). 15.40 — «Музычны кіёск» (М). 16.20 — «Сельскі клуб». «Год твайго жыцця» (М). 17.35 — «Навіны дня». Кінахроніка (М). 17.45 — прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 20.00 — тэлевізійныя навіны (М). 20.30 — «Два гады над безданню». Мастацкі фільм (М).

Другая праграма. 14.00 — конкурс сучаснага бальнага танца. Заключны тур. 18.20 — дзіцячы экран. «Мядзведзік Рымышмцы». Лялечны фільм. 19.00 — «Вецер вандраванняў». Тэлевізійнае падарожжа. 19.40 — «Трывожная маладосць». Мастацкі фільм. 21.15 — канцэрт майстроў мастацтваў БССР.

У калгасе «Зара» Карэліцкага раёна два гады працуе музычная студыя. Сорак дзяцей хлебаробаў вучацца мастацтву ігры на баяне і фартэпіяна. Кіруе студыяй выпускнік Маладзечанскага музычнага вучылішча Віктар Кукаяшны. Віктар паспяхова сумяшчае работу з вучобай — ён студэнт-завочнік 2-га курса Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

На здымку — Віктар Кукаяшны са сваімі вучнямі Георгіем Сяргеевым і Марыяй Будзейка.

Фота Ул. КАШКАНА.

ТУРАЎСКІЯ ТАНЦОРЫ

Тры гады кіруе танцавальным калектывам Тураўскага Дома культуры Мікалай Котаў. Ён паставіў некалькі дзесяткаў танцаў — сольных, масавых. Некалькі кампазіцый склаў сам. Сярод іх — «Мы з Турава», «Вечарынка ў калгасе», «Беларуская маладзёжная», «Яблынька».

Танцавальны калектыў часта выступае з канцэртамі перад працоўнымі Тураўшчыны.

Я. АЛЬБЯРСОН.

ЗАХАПЛЕННЕ СУР'ЁЗНАЕ І ГЛЫБОКАЕ

СПРАВАЗДАЧНЫ КАНЦЭРТ СТУДЭНЦКАГА АРКЕСТРА

Перад пачаткам канцэрта аркестра народных інструментаў БДУ я запыталася ў Святланы Данілюк, што яна думае аб сваім выступленні з самадзейным калектывам. Салістка Беларускага тэатра оперы і балета, не задумваючыся, сказала:

— Само існаванне такога студэнцкага аркестра — радасны факт. Калі я прыйшла на рэпетыцыю, мяне здзівілі і ўзрадавалі ўлюбёнасць маладых аркестрантаў у музыку, іх энтузіязм. Выступаць з імі вельмі прыемна.

Паслухаўшы канцэрт, невялікі па колькасці нумароў, але вельмі святочны, светлы, хочацца далучыцца да гэтых цёплых слоў пра калектыў і яго кіраўніка.

Аркестр народных інструментаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна нядаўна атрымаў званне лаўрэата рэспубліканскага фестывалю самадзейных калектываў, прысвечанага 50-годдзю Вялікага Кастрычніка. Яго мастацкі кіраўнік і дырыжор Міхаіл Лісіцын здолеў стварыць згуртаваны, добра арганізаваны калектыў.

Між тым у рабоце самадзейнага аркестра ёсць вельмі вялікая цяжкасць — цякучасць аркестрантаў. Кожны год сцены універсітэта пакідаюць дзесяткі юнакоў і дзяўчат, многія з іх пакідаюць і аркестр. Кожны год даводзіцца клапаціцца аб папаўненні калектыву. Зноў — навучанне музычнай грамаце, удасканаленне ўмельства аматараў. У гэту работу разам з М. Лісіцыным укладваюць многа сіл пастаянныя педагогі аркестра — заслужаны артыст БССР Х. Шмелькін, студэнт-дыпломнік Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі В. Шчарбок.

Праца педагогаў, дырыжора была прадстаўлена на суд слухачоў у канцэрце, які адбыўся нядаўна ў актавай зале універсітэта. Для студэнцкага аркестра гэты канцэрт быў творчай справаздачай, сур'ёзнай і адказнай.

У праграму ўвайшлі творы савецкіх, у тым ліку беларускіх кампазітараў, рускай і зарубежнай класічнай музыкі. Сёе-тое ўдалося больш, а сёе-тое менш...

Святочная уверцюра А. Багатырова, якая адкрыла канцэрт, паказала аркестр у «народным», святочным гучанні. Выконваючы танец з «Палескай сюіты» Я. Глебава, маладыя музыканты прадэманстравалі ўменне перадаць чароўную стыхію руху, сардэчнасць паэтычнага выказвання. Добрае ўражанне пакінулі і іншыя інструментальныя нумары.

Удалым было і выступленне прафесіянальных спевакоў з аркестрам. Лаўрэат Усесаюзнага і дыпламантка Міжнароднага конкурсаў вакалістаў Святлана Данілюк спявала «Серэнаду прыгажуні» Д. Кабалеўскага з яго музыкі да радыёспектакля «Дон-Кіхот» і песню «Беларусь — мая песня» Ю. Семянякі. Як заўсёды, сакавіта, напоўнена гучаў прыгожы голас спявачкі, а аркестр чула акампаніраваў ёй. Анатоль Калеснічэнка выканаў песню С. Тулікава «Радзіма» і «Песню бабыля» А. Туранкова.

Можна, безумоўна, зрабіць і некалькі заўваг. «Аве Марыя» Ф. Шуберта, напрыклад, была выканана ў вельмі хуткім тэмпе, нават мітуслива, без належнага ўнутранага напаўнення. Больш нюансаў хацелася б пачуць у Рамансе Д. Шастаковіча. Дзесьці ледзь-ледзь адставалі басы; часам аркестр заглушаў голас спевака («Песня бабыля»). Аднак агульнае ўражанне ад канцэрта, паўтараю, засталося добрае.

У сувязі з гэтым незразумела, чаму многія іншыя самадзейныя калектывы, якія ярка паказваюць сябе ў дні фестываляў і аглядаў, ніколі не выходзяць на канцэртную эстраду ў «будні», не бяруць прыклад з універсітэцкага аркестра. Перадсвяточныя «аўралы» ў мастацтве вельмі непажаданыя. І калі работа калектываў ажыццяўляецца толькі ад фестывалю да фестывалю — гэта трывожны сімптом.

І яшчэ адна заўвага, якую хацелася б зрабіць у сувязі з канцэртам аркестра. Праграма яго была складзена з твораў, перакладзеных для аркестра. І толькі адзін твор — фантазія на тэмы песень Алоўнікава, які належыць пяру непрафесіянальнага аўтара — Андрэя Шпянёва (дарэчы, нядрэнна зроблены) — быў напісаны спецыяльна для гэтага калектыву. Несумненна, што народны аркестр універсітэта заслугоўвае ўвагі беларускіх кампазітараў. Самадзейныя музыканты маюць права спадзявацца, што для іх будуць спецыяльна напісаны канцэртныя п'есы, якія трывала ўвойдуць у рэпертуар аркестра.

А. РАКАВА.

На той бок

ЗЛАШЧАСНАЯ ТРЭШЧЫНА...

Фальсіфікацыя ў мастацтве — рач, на жаль, не рэдкая. Падробкі прадметаў старадаўнасці — таксама. Іншы раз падробкамі доўга любуюцца мільёны людзей, перш чым вучоныя выкрыюць фальсіфікацыю.

Падобны выпадак, як паведамілі днямі агенцтва АД, быў у Нью-Йорку, у буйнейшай амерыканскай скарбніцы твораў мастацтва старажытнасці, сярэдніх вякоў і сучаснасці — Метраполітан-музеі. Выдатная старажытнагрэчаская статуя каня, якая прыкладна адносілася да V стагоддзя да н. э., аказалася самай звычайнай падробкай.

Прыгожая бронзавая статуэтка вышынёй 38 см сорак чатыры гады была адным з папулярных экспанатаў музея і лічылася выдатным узорам старажытнай бронзы. І вось днямі, канчаткова пераканаўшыся, віца-дырэктар музея Джазэф В. Нобл быў вымушаны сказаць сумную фразу: «Яна цудоўная, але фальшывая».

Цень сумнення з'явіўся ў містэра Нобла яшчэ ў 1961 годзе, калі ён выявіў, што ўпоперак спіны і ўніз па нагах статуі каня ўецца тоненькая нітачка трэшчыны. Гэта навяло яго на думку аб тым, што фігурка была адліта ў пясочнай форме — метад, які быў вынайдзены толькі ў XIV стагоддзі н. э. Падазрэнні віца-дырэктара, нарэшце, спраўдзіліся. Аказалася, што статуя каня з'явілася на свет зусім не ў старажытнай Грэцыі і зусім не да нашай эры, а гадоў за пясць да таго, як у 1923 годзе яе набыў Метраполітэн-музей.

Адзіная ўцеха ва ўсёй гэтай гісторыі — сам факт выяўлення падробкі, ды яшчэ тое, што яна адліта, відаць, надзвычай здольным скульптарам. Джазэф Нобл мяркуе, што гэта рэч зроблена ў Парыжы. Фальшыўка сама па сабе з'яўляецца цудоўным узорам асобай тэхнікі бронзавага ліцця, якая ўжывалася ў тыя гады ў Францыі.

Паўвеку праходзілі па залах Метраполітэн-музея наведвальнікі, нямала спецыялістаў цікавіцца унікальным экспанатам, які мог, здавалася, даць уяўленне аб высокай ступені чалавечых здольнасцей даве з палавінай тысячы гадоў назад. І толькі маленькая трэшчына дазволіла аразумець, якіх высокіх ступеняў поддасці змог дасягнуць чалавечы талент з таго часу, калі мастацтва раскалола бездань бізнесу.

Л. ГРУНАЎ.
(ТАСС).

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

ПРАДПРЫЕМСТВЫ СУВЯЗІ З 15 ТА 24 СНЕЖНЯ ПРЫМАЮЦЬ НАВАГОДНІЯ ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ ПА ЛЬГОТНАМУ ТАРЫФУ — У ДВА РАЗЫ ДЗЕШАВЕЙ, ЧЫМ ЗВЫЧАЙНА.

ДА 24 СНЕЖНЯ ПРЫМАЮЦЦА ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ З ТЭРМІНАМ УРУЧЭННЯ, УСТАНОЎЛЕНЫМ АДПРАЎНІКАМ ТЭЛЕГРАМЫ

Пасылайце навагоднія віншаванні з дастаўкай на мастацкіх тэлеграфных бланках, карыстайцеся спецыяльнымі паштоўкамі.

АДПРАЎЛЯЦЬ ВІНШАВАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ, ПІСЬМЫ І ПАШТОЎКІ ЗАГАДЗЯ.

Не адкладвайце адпраўку віншаванняў на апошнія перадсвяточныя дні: прадпрыемствы сувязі з прычыны вялікай перагрузкі гарантаваць своечасовую дастаўку тэлеграм, пададзеных напярэдадні свята, не могуць.

СПЯШАЙЦЕСЯ ПАВІНШАВАЦЬ ВАШЫХ РОДНЫХ, СЯБРОЎ І ЗНАЁМЫХ З НАДЫХОДЗЯЧЫМ НОВЫМ ГОДАМ!

Міністэрства сувязі БССР.

ГОМЕЛЬСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ ЗАПРАШАЕ НА РАБОТУ

АРТЫСТА РАЗМОЎНАГА ЖАНРУ — КАНФЕРАНСЬЕ, ЯКІ ДОБРА ВЕДАЕ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ.

З прапановамі могуць звяртацца ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці.

Даведкі па тэлефоне: Гомель, 2-85-66.

Дырэкцыя.

УСІМІ ФАРБАМІ ЖЫЦЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Нельга разбазарваць свае заваяванні, тым больш — ва ўгоду модзе. Такія нашы майстры, як Дэйнека, Ніскі, Чуйкоў, Стажараў ніколі не «перафарбоўваліся», прыстасоўваючыся да подыху моды.

У апошні час многа гаворыцца аб праблеме нацыянальнага ў мастацтве. Але калі ж адбудзецца размова аб гістарызме, аб тыпажы, аб сюжэце, аб крытэрыях у ацэнцы твораў? Калі мы перастанем штучна захвальваць адны работы і прыніжаць або замоўчваць другія, кіруючыся толькі тым, зроблены яны ў «наватарскім» плане або не? Многія ўчарашнія «навацыі» цяпер здаюцца ўстарэлымі, а палотны, напісаныя сотні гадоў назад, па-ранейшаму ўзрушаюць гледача.

Размова пра ўсё гэта наспела ўжо даўно, аднак секцыя крытыкі Саюза мастакоў «дрэмле». А ў прэсе часам друкуюць малааргументаваныя, некваліфікаваныя матэрыялы, дзе пераважае не ўдумлівы аналіз, а голы пералік работ і прозвішчаў аўтараў, дзе крытыкі больш заклапочаны раздачай лаўраў і церняў, чым пастаноўкай і вырашэннем сур'ёзных творчых пытанняў.

Нельга пагадзіцца з думкай, што арганізацыйныя справы ляжаць у баку ад творчага працэсу. Іншы раз даводзіцца чуць такую фразу: «Узаемаадносіны — справа другарадная, галоўнае — працаваць трэба». Але калі гэтыя ўзаемаадносіны прымаюць нездаровую афарбоўку, калі напаляюцца страсці, працаваць становіцца цяжка. Я ведаю мастакоў, якія працуюць ніжэй сваіх магчымасцей з-за таго, што адчуваюць нетаварыскія да сябе адносіны, з-за таго, што іх стараюцца пастаянна трымаць у ценю. І ёсць другія, якія настолькі захапіліся «вярчэннем на арбіце», што выклікаюць проста спачуванне. Да прыкладу, кожны другі член праўлення Саюза мастакоў з'яўляецца членам выставачнага камітэта, двух-трох мастацкіх саветаў (Мастацкага фонду, выдавецтваў, гандлёвай палаты і інш.). Зразумела, сур'ёзна працаваць такі «засядальнік» ні ў адным савеце не можа. А ад яго ж часта залежыць лёс твора, за якім стаіць мастак са сваімі роздумамі і пошукамі...

У заключэнне я зноў хачу вярнуцца да пытання аб сучаснасці мастацтва. Тое, што жыве, тое, што знаходзіць водгук у душы гледача, тое, што спыняе яго і выклікае ў душы хвалю роздумаў, — сучаснае, у якой бы творчай манеры гэта ні было напісана. Як сказаў Марцірос Сар'ян, «таленавітыя творы выходзяць за межы часу, дрэнныя — хутка паміраюць». А хто спяшаецца з ацэнкай тых або іншых твораў, не думаючы пра ацэнку часам, павінен, на мой погляд, задумацца над вызначэннем мастацкіх крытэрыяў. Толькі тады мы па-гаспадарску разбяромся ў дасягненнях і праліках нашага выяўленчага мастацтва.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН (намеснік галоўнага рэдактара), А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. За харава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24